У Мінск з аднаго з манастыроў Святой Гары Афон прыбудзе каўчэг з часцінкай Пачэснага Жыватворнага Крыжа Гасподняга і мошчаў святой вялікамучаніцы Варвары і святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны. СТАР. 2

У праграме 65-га Канскага кінафестывалю, які пройдзе на французскім Лазурным беразе з 16 па 27 мая, фільм «У тумане» ўраджэнца Беларусі Сяргея Лазніцы, які цяпер жыве ў Берліне. СТАР. 3

Няправільнае выкарыстанне лекаў прывяло да сітуацыі, калі рынак літаральна засмечаны неэфектыўнымі, бескарыснымі ці неапраўдана дарагімі медыкаментамі. СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 КРАСАВІКА 2012 г. СУБОТА № 79 (27194) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У БЕЛАРУСІ ЗНІЖАЕЦЦА ЎЗРОСТ ДЛЯ АБАВЯЗКОВАГА АТРЫМАННЯ ПАШПАРТА З 16 ДА 14 ГАДОЎ

У Беларусі ўнесены дапаўненні і змяненні ў пералік адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян (пералік зацверджаны ўказам ад 26 красавіка 2010 года № 200). Адпаведны ўказ № 197 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 19 красавіка.

Дакумент павінен максімальна аблегчыць вырашэнне грамадзянамі паўсядзённых пытанняў, звязаных з шэрагам адміністрацыйных працэдур.

У адпаведнасці з указам прадугледжваецца надзяленне замежных грамадзян, якія часова пражываюць у Беларусі, а таксама грамадзян Беларусі, якія пастаянна пражываюць за яе межамі, правам на атрыманне вадзіцельскага пасведчання на права кіравання транспартным сродкам, на яго абмен, выдачу талонаў да яго, а таксама на рэгістрацыю гэтымі катэгорыямі асоб у Беларусі транспартных сродкаў.

Замежным грамадзянам, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі і жадаюць займацца паляваннем, прадастаўляюцца правы на набыццё і захоўванне на тэрыторыі Беларусі грамадзянскай зброі і боепрыпасаў, а замежным грамадзянам, якія часова пражываюць у Беларусі, — права на набыццё на тэрыторыі Беларусі, увоз у краіну і вываз з краіны грамадзянскай зброі і боепрыпасаў.

Указам зніжаецца ўзрост грамадзяніна Рэспублікі Беларусь для абавязковага атрымання пашпарта з 16 да 14 гадоў, што дасць магчымасць непаўналетнім, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту, рэалізаваць правы, якія ім належаць, на ажыццяўленне асобных юрыдычна значных дзеянняў (напрыклад, уносіць грашовыя сродкі ў банкі і распараджацца імі).

Дакументам прадугледжваецца таксама магчымасць ажыццяўлення працэдур па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй у паскораным парадку (за дадатковую плату).

Акрамя таго, скасоўваецца шэраг адміністрацыйных працэдур (напрыклад, выдача дазволу на набыццё радыёэлектронных сродкаў, пасведчання аб рэгістрацыі заалагічнай калекцыі) і ўводзяцца новыя адміністрацыйныя працэдуры, неабходныя для рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў, прадугледжаных іншымі заканадаўчымі актамі (напрыклад, выдача даведак, неабходных для дзяржаўнай рэгістрацыі садовага доміка або гаража, атрыманых у спадчыну, пасведчання эксперта па паляўнічых трафеях).

Адмяняецца плата за ажыццяўленне некаторых адміністрацыйных працэдур (напрыклад, афармленне пастаяннага пражывання за межамі краіны грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які не дасягнуў 14-гадовага ўзросту) або змяншаецца памер такой платы (напрыклад, прастаўленне апостылю, выдача паўторнага пасведчання аб рэгістрацыі акта грамадзянскага стану).

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

■ Жывая зямля

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Навучэнцы Юркевіцкай, Ленінскай і Мілевіцкай школ Жыткавіцкага раёна сталі ўдзельнікамі міжнароднай прыродаахоўнай акцыі па выратаванні рэдкага віду птушкі.

САВУК-ЛУТОК ХОЧА ГНЕЗДАВАЦЦА!

Старэйшы рыбгас краіны «Белае» (заснаваны ў 1926 годзе) аб'яўлены тэрыторыяй, важнай для птушак, і будзе з'яўляцца ўдзельнікам вялікага праекта па захаванні рэдкіх відаў. Днямі адбылася перадача рыбгасу ахоўных абавязацельстваў у рамках праекта ПРААН/ГЭФ «Інтэграцыя пытанняў захавання біяразнастайнасці ў палітыку і практыку тэрытарыяльнага планавання ў Беларусі». СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Міністр па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПАЛУЯН:

«Падатковыя органы павінны выйсці на якасна новы ўзровень падатковага адміністравання. Асноўны акцэнт накіраваны на мінімізацыю непасрэднага кантакту паміж падаткаплацельшчыкам і падатковымі органамі за кошт укаранення сучасных ІТ-тэхналогій, спрашчэння парадку вылічэння і аплаты падаткаў. Упэўнены, што сістэма электроннага дэкларавання будзе адпавядаць усім неабходным патрабаванням, стане неад'емнай часткай працэсу падаткаабкладання і забяспечыць якасна новы ўзровень абслугоўвання падаткаплацельшчыка».

Аляксандр БОЙКА:

«ПЕРШ ЧЫМ ЗРАБІЦЬ АДКАЗНЫ КРОК, ТРЭБА ВЕДАЦЬ УСЕ ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ...»

Пытанні магчымага пераходу на іншую сістэму аплаты працы педагагічных работнікаў і аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў чарговага пасяджэння Прэзідыума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Як паведаміў **старшыня ЦК галіновага прафсаюза педагогаў Аляксандр БОЙКА**, ёсць намер з 1 студзеня 2013 года запусціць у Мінску пілотны праект па ўкараненні новай «падушавой» сістэмы аплаты працы накшталт той, што ўжо дзейнічае ў Расіі, дзе грошы ў выглядзе ваўчара прывязваюцца да канкрэтнага дзіцяці. Фінансаванне такім чынам ідзе следам за вучнем, прымушаючы педагогаў змагацца за кожнае дзіця.

— Для таго, каб нам быць гатовымі да работы ў новых умовах, трэба неадкладна заняцца вывучэннем досведу нашых суседзяў — расіян. Улічваючы складанасць гэтага пытання і тую колькасць людзей, якую закране ўкараненне новай сістэмы фінансавання, трэба мець дакладнае ўяўленне, куды мы ўсе рухаемся. СТАР. 2

СЁННЯ — РЭСПУБЛІКАНСКІ СУБОТНІК

Генеральнае прыбіранне

Больш за 400 тысяч жыхароў Магілёўскай вобласці 21 красавіка выйдуць на суботнік. Плануецца зарабіць прыкладна 5 мільярдаў рублёў. Кожны жыхар павінен прыбраць тэрыторыю вакол свайго дома і месца працы. Прадстаўнікі абласных структур паедуць у Горкі, дзе сёлета будуць прымаць «Дажынкі», і там ударна папрацуюць. Плануецца, што палова зароблены на суботніку грошай будзе выдаткавана на будаўніцтва музея Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

Ілона ІВАНОВА.

ЗОРКА ПАЭТА Ў НЯБЁСАХ АЙЧЫНЫ

З гэтай паездкі пачалася сумесная акцыя газет «Звязда», «Мінская праўда», мінскіх абласных арганізацый Беларускага саюза журналістаў і Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і ўпраўлення культуры Мінаблвыканкама «Шляхамі паэтаў». СТАР. 3

Паэт Рагнед МАЛАХОЎСКІ з вучнямі Сваткаўскай школы.

ШЛЯХАМІ ПАЭТАЎ

Пількаўшчына. Тут высіцца стары дуб, пасаджаны яшчэ дзедам Максіма Танка.

«ЗВЯЗДА» ЗАПРАШАЕ НА СВОЙ СТЭНД!

У Мінску 25 красавіка адкрыецца XVI Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі».

Традыцыйна на выставе свой стэнд мае і наша «Звязда». Сёлета ён будзе пашыраны — пад адным «дахам» з найстарэйшай беларускай газетай будуць несці мову ў народ такія выданні, як «ЛіМ», «Вожык», «Полымя», «Нёман» і «Маладосць».

Для шаноўных падпісчыкаў і чытачоў (як без гэтага!) рыхтуюцца сюрпрызы. Раскрыем толькі некаторыя з іх. Па-першае, наведнікаў чакаюць віктарыны і розыгрышы, прымеркаваныя да 95-годдзя «Звязды». Таму, каб атрымаць прыемны прыз, рэкамендуецца асвяжыць у памяці ўсё, што вы ведаеце пра юбілярку. Па-другое, у праграме — танцавальнае караоке і шарж-сесія ад «Вожыка». Акрамя таго, штодзень чакаюцца шматлікія «аўтограф-сесіі» з удзелам беларускіх пісьменнікаў, а ў падпісчыкаў будзе магчымасць сустрэцца з любімымі аўтарамі і фотакарэспандэнтамі. А 27 красавіка адбудзецца розыгрыш білетаў у тэатр.

Нагадаем, што падчас працы выставы ў павільёне Футбольнага манежа (праспект Пераможцаў, 20/2) будуць пускаць толькі па запрашальных білетах. Таму не забудзьцеся выразаць (і запоўніць!) у нумары «Звязды» за 20 красавіка рэгістрацыйны купон. Апошні на ўваходзе можна будзе абмяняць на запрашальны білет. Сваю працу міжнародная выстава працягне да 28 красавіка.

Надзея ДРЫЛА.

БЕЛИНВЕСТБАНК
ВРЕМЯ ОТКРЫТИЙ

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2012 г.

Наименование банка: **ОАО «Белинвестбанк»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2012 год	2011 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		895 072,9	372 065,3
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		3 690,2	2 535,4
4	Средства в Национальном банке	1103		1 227 828,4	693 309,2
5	Средства в банках	1104		703 490,4	245 641,5
6	Ценные бумаги	1105		895 816,6	581 646,8
7	Кредиты клиентам	1106		10 076 522,1	6 006 483,3
8	Производные финансовые активы	1107		652 300,7	10 268,3
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		2 689,5	623,0
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		894 067,5	338 002,3
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		4 815,6	4 024,3
12	Прочие активы	1111		129 809,0	71 892,2
13	**ИТОГО активы**	**11**		**15 486 102,9**	**8 326 491,6**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		369 866,7	1 136 473,6
16	Средства банков	1202		1 491 033,3	724 437,5
17	Средства клиентов	1203		10 429 924,6	4 864 189,5
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		1 403 185,9	630 115,7
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	513,4
20	Прочие обязательства	1206		104 666,7	47 413,8
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**13 798 677,2**	**7 403 143,5**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		539 037,9	442 089,6
24	Эмиссионный доход	1212		0,1	0,1
25	Резервный фонд	1213		44 173,0	39 074,8
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		661 814,0	165 357,3
27	Накопленная прибыль	1215		442 400,7	276 826,3
28	**ВСЕГО капитал**	**121**		**1 687 425,7**	**923 348,1**
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**15 486 102,9**	**8 326 491,6**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2012 г.

Наименование банка: **ОАО «Белинвестбанк»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2012 год	2011 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		692 962,1	204 733,7
2	Процентные расходы	2012		590 417,3	134 654,7
3	Чистые процентные доходы	201		102 544,8	70 079,0
4	Комиссионные доходы	2021		95 744,2	54 140,2
5	Комиссионные расходы	2022		18 854,4	18 026,1
6	Чистые комиссионные доходы	202		76 889,8	36 114,1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		683,0	92,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(2,1)	(57,1)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		47 566,9	5 367,1
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		1 979,5	8 688,1
11	Чистые отчисления в резервы	207		9 718,9	11 077,9
12	Прочие доходы	208		31 044,3	14 334,1
13	Операционные расходы	209		154 174,2	77 029,6
14	Прочие расходы	210		21 706,2	9 022,4
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		75 106,9	37 488,1
16	Налог на прибыль	212		10 752,9	3 976,8
17	Прибыль (убыток)	2		64 354,0	33 511,3

Первый заместитель председателя Правления **Н.Ф. Прима**

Главный бухгалтер **А.Н. Сырокваш**

www.belinvestbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3, выдана Национальным банком Республики Беларусь 27.10.2006.
Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПЕНТАГОН РЫХТУЕ ЎДАР ПА ІРАНЕ

ЗША маюць пэўны план нанясення ўдараў па Іране. Міністр абароны краіны Леон Панета ў інтэрв'ю тэлеканалу CNN расказаў, што ўжо завершана распрацоўка планаў нападзення на ядзерныя аб'екты Ірана. У сваю чаргу Іран у чаканні атакі ўмацоўвае сваю супрацьпаветраную абарону. Тэгеран ужо абвясціў пра паспяховую распрацоўку і пачатак вытворчасці кампанентаў уласнага зенітна-ракетнага комплексу, здольнага замяніць расійскае ўзбраенне.

ПАЛІЦЭЙСКІ АДМОВІЎСЯ АД ХАБАРУ Ў RUB 4 МЛН

Днямі ў Расіі 35-гадовая цыганка спрабавала даць хабар у суме 4 мільёны расійскіх рублёў старшаму оперупаўнаважанаму па асабліва важных справах аддзела аператыўнай службы УФСКН па Краснаярскім краі. За гэтыя грошы жанчына прасіла спыніць вышуковыя мерапрыемствы ў дачыненні яе сястры, якая падазраецца ў незаконным абарачэнні наркотыкаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

УКРАІНА МЯНЯЕ «МАЛЕНЬКАГА ПРЫНЦА» НА «ГАРЫ ПОТЭРА»

Ва ўкраінскіх школах будзе істотна зменена праграма па замежнай літаратуры. Колькасць класічных твораў, якія будуць вывучацца, зменшыцца. Замест іх у праграму ўключаць папулярныя сучасныя кнігі (у прыватнасці — у жанры фэнтэзі).

Новую праграму для вучняў 5—9 класаў распрацавала міністэрства адукацыі Украіны. У прыватнасці, з пераліку твораў, якія вывучаюцца ў шостым класе, прыбяруць «Маленькага прынца» Антуана дэ Сэнт-Экзюперы. Замест яго школьнікам прапануюць «Гары Потэра» Джаан Роўлінг. З праграмы пятага класа знікне «Маўглі» Кіплінга, з праграмы сёмага — «Айвенга» Скота, восьмага і дзявятага — «Фаўст» Гётэ і «Боская камедыя» Дантэ. Замест іх з'явяцца, у прыватнасці, «Стары з крыламі» Маркеса, «Чужы боль» Лук'яненкі і «Алхімік» Каэльё. Прэзентацыю праграмы міністэрства адукацыі правяло ў пачатку красавіка. У ведамстве, праўда, адзначаюць, што канчаткова яна пакуль не зацверджана. Супраць праграмы тым часам выступілі настаўнікі замежнай літаратуры ў Кіеве. Яны накіравалі адкрыты ліст на імя міністра адукацыі Дзмітрыя Табачніка. Аўтары ліста лічаць, што праект не адпавядае дзяржаўным адукацыйным стандартам, перагружае вучняў і скажае іх уяўленне пра сусветны літаратурны працэс.

ISSN 1990 - 763X

НА КАГО З ПРОДКАЎ ВЫ ХАЦЕЛІ Б БЫЦЬ ПАДОБНЫМІ? ЯКІЯ ІХ ЯКАСЦІ НАЙБОЛЬШ АКТУАЛЬНЫЯ Ў СУЧАСНЫМ ЖЫЦЦІ?

Ганна ДАВЫДАВА, загадчыца Мілаславіцкай урачэбнай амбулаторыі ў Клімавіцкім раёне:



— Я хачу быць падобнай на маю бабулю Лізавету Рыгораўну Давыдаву. Таму што яна чалавек мэтанакіраваны, актыўны і заўсёды дамагаецца таго, што хоча. У свае 82 гады яна не толькі пры добрай памяці і на сваіх нагах, але і па-ранейшаму бегае на высокіх, за 10 сантыметраў, абцасах! А для гэтага (жанчыны зразумеюць!) патрэбны моцны дух.

Бабуля цяпер жыве ў Сімферопалі. Калісьці яна, малады мікрабіёлаг, трапіла ў Клімавічы па размеркаванні. Працавала на мясцовым маслазаводзе, а калі выйшла на пенсію, то з'ехала на радзіму. У яе рана памёр муж, яна сама выгадавала траіх дзяцей і ніколі не скардзілася на жыццё. Наадварот, ёй зайздросцілі і бралі з яе прыклад.

Аляксей БАЦЮКОЎ, дырэктар музея гісторыі Магілёва:

— Я б хацеў быць падобным на індускага філосафа Махатму Гандзі. Ён мой культавы герой. Таму што гэта чалавек, які змяніў свет, адначасова мяняючы самога сябе ў ім. Галоўнае ў яго філасофіі — любоў да людзей і негвалтоўнае супраціўленне злу. Супраціўленне праз асабісты духоўны рост. Вектар, накіраваны не на навакольны свет, а на самога сябе? Але так атрымалася, што праз сваё ўдасканаленне ён змяніў і свет: прывёў Індыю да незалежнасці і самапавагі. Такое жыццё і дзейнасць патрабуюць мужнасці.

Увогуле беларусы падаюцца мне своеасаблівымі еўрапейскімі індусамі. Мы мірны і высакародны народ. Мы больш засяроджаны на сабе і ўласным духоўным свеце, чым на знешніх падзеях. Мы вышэй за «дробязі» гэтага жыцця.

Мікалай ПАТРОНЧЫК, кіраўнік унітарнага камунальнага дачынага будаўнічага прадпрыемства «Круглянская перасовачная механізаваная калона № 266»:



— Трэба памятаць, як нашы продкі добра працавалі. Я, напэўна, падобны на свайго бацьку Васіля Пятровіча. Ён быў сапраўдным працаголікам і моцным чалавекам. Бацька быў настаўнікам, працаваў дырэктарам школы. Прычым тады ў сельскай школе было больш за 800 вучняў, і ён кожны вучэбны дзень праводзіў 6 урокаў. Бацька выкладаў гісторыю, але мог выкладаць і матэматыку, і нямецкую мову, і рускую літаратуру. У Васіля Пятровіча ўвесь дзень быў распісаны па хвілінах, нават на пенсіі. Бо да настаўніцкай працы трэба дадаць і хатнюю гаспадарку, і выхаванне ўласных дзяцей, а нас чацвёра — тры браты і сястра. Мая маці таксама была настаўніцай.

Усе мы з дзецьмі і ўнукамі збяромся ў аўторак, на Радаўніцу, у Круглым, каб памянуць нашых продкаў. Як і многія людзі, у гэты дзень мы пакладзём кветкі на магілы, прамовім словы, узгадаем нашых бацькоў. Я думаю, у іх нам трэба навучыцца любіць Радзіму, сваіх дзяцей і гэтае жыццё.

Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.

■ З эканамічнага пункту гледжання

«ЭФЕКТЫЎНЫЯ ГАСПАДАРКІ ВЫЖЫВУЦЬ...»

А ПОШНІЯ падзеі эканамічнага жыцця краіны каментуе Ірына НОВІКАВА, загадчыца кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, прафесар.

— Пакуль сітуацыя ў эканоміцы большменш стабільная, прадказальная. З валютай нічога страшнага не адбываецца. Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў заявіў, што больш за 200 прадпрыемстваў рыхтуюць да прыватызацыі. Гэта гаворыць пра тое, што мы выконваем патрабаванні Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, ад якога атрымалі крэдыты. Добра ідуць інтэграцыйныя працэсы ў Адзінай эканамічнай прасторы.

Асаблівая ўвага на мінулым тыдні была нададзена сельскай гаспадарцы ў сувязі з паездкамі Прэзідэнта па некаторых сельскагаспадарчых аб'ектах. Але гэта таксама нельга лічыць навіной, бо яшчэ летась ішла размова аб тым, каб павялічыць экспарт прадуктаў харчавання. Цэны ж у свеце на іх растуць — гэта выгадна. А што ж тычыцца скарачэння дзяржаўнага фінансавання сельскай гаспадаркі, то гэта таксама патрабаванне Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. Сёння мы маем выдаткі на дзяржаўныя праграмы — 7% ад ВУП. За бліжэйшыя гады іх трэба давесці да 2-3%. Таму гэта проста выкананне патрабаванняў фонду. А значыць, мы развіваемся прадказальна. І паказваем знешняму свету, што выконваем тое, што абавязаны. Асабіста я лічу, што скарачэнне фінансавання — правільны крок. Няхай думаюць, як зарабіць грошы самім. Чаму мы з вамі павінны за кошт нашых падаткаў утрымліваць сельскую гаспадарку? Гэта адбываецца дзесяцігоддзямі. А працаваць эфектыўна навучыліся далёка не ўсе. Эфектыўныя гаспадаркі выжывуць, а неэфектыўныя, лічу, няхай перадаюць прыватнікам.

Запісаў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

АД ГАНДЛЮ — ДА ЎЗАЕМНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Як паведамляла «Звязда», у Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адбылася грунтоўная размова аб ролі СМІ Беларусі і Кітая ў дынамічным, шматгранным і вельмі перспектыўным партнёрстве абедзвюх краін.

Паводле слоў **намесніка міністра інфармацыі Уладзіміра МАТУСЕВІЧА,** Беларусь і Кітай паспяхова супрацоўнічаюць ва ўсіх сферах: палітычнай, эканамічнай, сацыяльна-культурнай і г.д. Узаемадзеянне дынамічна развіваецца і паміж СМІ. У прыватнасці, паспяхова рэалізуецца дамова аб супрацоўніцтве ў галіне інфармацыі і друку паміж Міністэрствам інфармацыі Беларусі і прэс-канцылярыяй Дзяржаўнага Савета КНР. Беларускае тэлеграфнае агенцтва, напрыклад, супрацоўнічае з інфармацыйным агенцтвам «Сіньхуа», а Белтэлерадыёкампанія — з Цэнтральным тэлебачаннем і міжнародным радыё Кітая. Беларускія журналісты рэгулярна ўдзельнічаюць у стажыроўках, якія арганізуе Кітай. Намеснік міністра інфармацыі таксама адзначыў, што жыхары і госці сталіцы змогуць пазнаёміцца з кітайскімі друкаванымі выданнямі на Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы і міжнароднай спецыялізаванай выставе «СМІ ў Беларусі». Ён таксама запрасіў прадстаўнікоў кітайскіх СМІ да ўдзелу ў Беларускім міжнародным медыяфоруме, ён адбудзецца ў Мінску 28-31 мая.

Трэба заўважыць, што месца для гэтай размовы было выбрана невыпадкова. Як адзначыў **рэктар БДУ, доктар тэхнічных навук, акадэмік НАН Беларусі Сяргей АБЛАМЕЙКА,** універсітэт актыўна супрацоўнічае з кітайскімі ВНУ. У БДУ навучаецца 800 кітайскіх грамадзян, з іх на журфаку — амаль сто студэнтаў з Кітая. Напярэдзе новыя і не менш значныя мерапрыемствы. Неўзабаве кітайскі горад Харбін наведае прадстаўнічая дэлегацыя навукоўцаў БДУ, іншых беларускіх універсітэтаў. У сваю чаргу **дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей ДУБОВІК** паведаміў, што ўжо стала традыцыяй у сценах Інстытута праводзіць розныя мерапрыемствы на актуальныя тэмы, на якіх зацікаўлена абмяркоўваецца і праблематыка міжнароднага супрацоўніцтва.

Нагодай для гэтай сустрэчы сталі важкія прычыны: 20-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж краінамі-партнёрамі і выхад іх стратэгічнага партнёрства на якасна новы ўзровень, адной з прыкмет якога з'яўляецца ўсё больш актыўнае і паспяховае ўзаемадзеянне рэгіёнаў Беларусі і Кітая. Прычым не толькі па лініі гандлёва-эканамічных адносін. У гэтым сэнсе цікавы і вельмі змястоўны даклад аб станаўленні і паступовым развіцці двухбаковых стасункаў за дваццацігадовы перыяд пасля ўсталявання дыпламатычных адносін зрабіў **Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Гун ЦЗЯНЬВЭЙ.** У сваім выступленні пасол ахарактарызаваў цяперашні этап кітайска-беларускіх адносін як этап вялікіх перспектыў і новых магчымасцяў. Ён зрабіў выснову: у апошнія гады ў дзелавых сувязях Беларусі і Кітая з'явіўся вельмі важны феномен, які дыпламат назваў як «паступовы адыход ад чыста гандлёвага да фінансава-інвестыцыйнага супрацоўніцтва». Прычым ён зрабіў акцэнт на тым, што размова ідзе не толькі аб кітайскіх інвестыцыях у эканоміку Беларусі, але і беларускіх інвестыцыях у Кітай.

Пасол спыніўся на самых значных сумесных праектах. Гасцінічны пяцізоркавы комплекс «Пекін», які ўзводзіцца ў цэнтры Мінска, павінен прыняць першых наведнікаў у красавіку 2014 года — напярэдадні адкрыцця ў беларускай сталіцы чэмпіянату свету па хакеі. Кітайскія інвестыцыі ў гэты аб'ект складуць 90 млн дол. ЗША. Пасол таксама падзяліўся ўражаннем ад нядаўняга візіту ў Віцебск, сустрэч з кіраўніцтвам рэгіёна. Там абмяркоўваліся ўмовы стварэння Парку высокіх тэхналогій. Увогуле, на думку Гун Цзяньвэя, за 20 гадоў Беларусь і Кітай сталі сапраўднымі партнёрамі і сябрамі. А гэта адкрывае новыя магчымасці для паглыблення двухбаковага супрацоўніцтва. Таму тэма стратэгічнага партнёрства і ўзаемадзеяння рэгіёнаў Беларусі і Кітая абяцае стаць адной з галоўных на старонках перыёдыкі, у тэле -і радыёперадачах.

Леанід ТУГАРЫН.

«ПЕРШ ЧЫМ ЗРАБІЦЬ АДКАЗНЫ КРОК, ТРЭБА ВЕДАЦЬ УСЕ ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэба ведаць усе падводныя камяні, бо ў нас няма такой фінансавай «падушкі бяспекі», якая ёсць у расіян. І толькі досведу расійскай сталіцы ў гэтым пытанні нам будзе недастаткова, бо Масква — гэта яшчэ не ўся Расія, як і Мінск — яшчэ не ўся Беларусь.

Між іншым, вядома, што ў Маскве збіраюцца аб'яднаць у новым навучальным годзе 40 школ, якія не толькі не змаглі набраць першыя класы, але і дэманструюць дрэнныя вынікі. Аўтары рэформы лічаць, што новыя правілы фінансавання, якія паставілі слабыя школы ў цяжкае становішча (маўляў, няма вучняў — няма і грошай), дапамогуць прыцягнуць кваліфікаваных педагогаў у моцныя школы, паколькі ў школ, дзе шмат вучняў, больш магчымасцяў плаціць настаўніку высокі аклад. Аднак бацькі вучняў аб'яднаных школ ужо збіраюць подпісы пад зваротамі пратэсту: адных не задавальняе перспектыва пераезду ў іншы будынак, другіх — з'яўленне ў школах класаў, дзе «двоечнікаў» на парадак больш. Незразумела пакуль, дзе моцныя школы знойдуць дастаткова моцных педагогаў, каб апраўдаць надзеі бацькоў, бо лічыцца, што толькі 20-30 працэнтаў настаўнікаў слабых школ могуць працаваць лепш. Кіраўнікі таксама ў паніцы: адных падначаленых давядзецца звальняць, а іншым прыйдзецца, наадварот, плаціць за траіх. Тэарэтычна, чым больш вучняў — тым вышэйшыя зарплаты, а чым менш — тым ніжэйшы аклад. Але як пасля аб'яднання размяркоўваць грошы? Дзяліць іх пароўну на ўсіх або плаціць усім па-рознаму? І нават чыноўнікі не ўпэўнены, што да 1 верасня ўдасца завяршыць аб'яднанне юрыдычна. Адным словам, і беларусам ёсць над чым паразважаць, перш чым пайсці на такі сур'ёзны крок...

Не менш актуальнае пытанне — аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі. За апошнія пяць гадоў у Беларусі было рэструктурызавана або закрыта каля тысячы ўстаноў адукацыі.

— На жаль, але гэта факт: калі школа закрываецца, гэта азначае, што ў населенага пункта няма будучыні, — канстатаваў **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО**, які прыняў удзел у пасяджэнні Прэзідыума. — А сёння здараецца, што на закрыцці школ настойваюць зусім не кіраўнікі раёна ці вобласці, а начальнікі аддзелаў ці ўпраўленняў адукацыі, быццам бы ў мэтах эканоміі сродкаў. Між іншым, працэс рэструктурызацыі заўсёды вымагае прадуманых і ўзважаных рашэнняў. І тут трэба думаць як пра інтарэсы дзяцей, так і аб тым, як і дзе будуць працаўладкаваны педагогі.

Удзельнікі пасяджэння канстатавалі, што, на жаль, ёсць адзінкавыя факты, калі закрыцці школы прадыктавана зусім не інтарэсамі дзяцей і паляпшэннем якасці адукацыйнага працэсу, а намерам перадаць іншай службе школьны будынак, што ўвогуле немагчыма ні зразумець, ні апраўдаць. Прыводзіўся прыклад школы, куды прывозяць дзяцей з 35 (!) населеных пунктаў! Нярэдка эканомія ад закрыцця школ увогуле аказваецца эфімернай. Зараз у нашай краіне функцыянуе 667 сельскіх школ з колькасцю навучэнцаў у сярэднім менш як 50 чалавек. Але калі ў начальнікаў абласных упраўленняў адукацыі пацікавіліся, колькі, на іх погляд, вучняў павінна быць у старэйшых класах, каб гэтую ступень школы можна было захаваць, то іх меркаванні на гэты конт разышліся: адны назвалі пяць вучняў, другія — сем. Аднак тут паўстае ўжо іншае пытанне: наколькі з эканамічнага пункту гледжання апраўдана вазіць два, тры, чатыры старшакласнікі з аддаленай вёскі ў вялікую школу за дзясяткі кіламетраў і тым самым пазбаўляць настаўнікаў сельскай школы працы? Адназначнага бачання сітуацыі пакуль няма, як невядомы пакуль і лёс гэтых школ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Садружнасць

БАРАЦЬБЕ СА ЗЛАЧЫННАСЦЮ ПЕРАШКАДЖАЕ ПАЛІТЫКА ДВАЙНЫХ СТАНДАРТАЎ

Пра гэта сказаў журналістам намеснік старшыні Выканкама СНД Тактасын БУЗУБАЕЎ падчас брыфінгу, прысвечанаму супрацоўніцтву дзяржаўудзельніц СНД у галіне бяспекі.

— Сёння няма агульнапрызнанай ва ўсім свеце фармулёўкі тэрарызму, і, як мы кажам, часам нашы калегі ў іншых краінах дапускаюць двайныя стандарты. Чачэнскіх экстрэмістаў называюць «змагарамі да дэмакратыю», — прывёў прыклад нявырашаных пытанняў у аб'яднанні міжнародных сіл супраць злачыннасці Тактасын Бузубаеў. — Гэта тычыцца і барацьбы з наркотыкамі. З пачаткам у Афганістане антытэрарыстычнай аперацыі колькасць наркотыкаў там узрасла ў 47-48 разоў! Удумайцеся ў гэтыя лічбы! Тут таксама, на жаль, мы бачым палітыку двайных стандартаў, бо, каб перапрацаваць 8 тысяч тон опію, якія там сёння атрымлтваюць, патрэбна не менш за 8 тысяч тон воцатнага ангідрыду — такую колькасць кантрабандай немагчыма завезці ў Афганістан. У адным чыгуначным саставе — 20-30 цыстэрнаў па 50 тон... Падлічыце, колькі саставаў патрэбна. Значыць, існуюць сур'ёзныя каналы.

На жаль, існаванне двайных стандартаў ускладняе міжнароднае супрацоўніцтва ў барацьбе са злачыннасцю, сказаў Тактасын Бузубаеў. Аднак падобных праблем унутры Садружнасці Незалежных Дзяржаў няма. «Так, бывае розніца ў дэталях і падыходах, акцэнтаванні, але ў прынцыповых пытаннях мы заўсёды знаходзім разуменне, і вынікам з'яўляецца зніжэнне агульнай колькасці зарэгістраваных злачынстваў у нашых краінах».

У цэлым па краінах Садружнасці колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў супраць асобы і злачынстваў супраць маёмасці знізілася ў параўнанні з 2010 годам на 3,8 працэнта.

Супрацоўніцтва дзяржаў СНД у сферы бяспекі ажыццяўляецца ў рамках 5 трохгадовых праграм (2011—2013 гады), якія прадугледжваюць барацьбу са злачыннасцю, незаконным абарачэннем наркотыкаў, тэрарызмам, гандлем людзьмі і супрацьдзеянне незаконнай міграцыі. Выкананне гэтых праграм мае на ўвазе работу над законамі і прававымі актамі, сумесныя аперацыі, абмен інфармацыяй і падрыхтоўку кадраў.

Летась у выніку аб'яднанай у межах Садружнасці працы было раскрыта больш за 26 тысяч злачынстваў, затрымана 14 тысяч асоб, якія знаходзіліся ў вышуку, спынена дзейнасць 312 арганізаваных злачынных груп, адабрана амаль 17 тысяч адзінак агнястрэльнай зброі, больш за 67 тон наркатычных рэчываў, выяўлена 26 фактаў гандлю людзьмі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ЦЯПЛО ПРАЗ ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ

Беларусы змогуць пакланіцца святыням Афона

29 КРАСАВІКА ў Мінск з аднаго з манастыроў Святой Гары Афон прыбудзе каўчэг з часцінкай Пачэснага Жыватворнага Крыжа Гасподняга (на якім быў укрыжаваны Ісус Хрыстос) і мошчаў святой вялікамучаніцы Варвары і святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны. Святыні будуць знаходзіцца ў сталічнай царкве святой Марыі Магдаліны да 5 мая, наступныя 2 дні — у Свята-Іверскім храме Бабруйска, з 7 па 9 мая — у Спаса-Праабражэнскім саборы Магілёва, з 9 па 11 мая — ва Успенскім саборы Віцебска і з 11 па 12 мая — у кафедральным Пакроўскім саборы Гродна.



Манастыр Сымонапятра (камень Сымона) XIII ст. — адзін з 20 манастыроў Афона, адкуль прыбудуць святыні ў Беларусь.

Храм роўнаапостальнай Марыі Магдаліны XIX ст. у Мінску, дзе святыні будуць знаходзіцца самы доўгі час — 6 дзён.

«Пасля заваявання Святой Зямлі арабамі ўсе іерусалімскія святыні былі перанесеныя ў Канстанцінопаль, — паведаміў журналістам старшыня брацтва імя святіцеля Мікалая Цудатворца Сяргей БАРТАШЭВІЧ. — Пасля захопу самога Канстанцінопаля і краху Візантыйскай імперыі рэлівіі былі вывезены на Святую Гару Афон і ў краіны Заходняй Еўропы. Перанясенне Святога Крыжа старанна дакументавалася».

Галоўная славутасць грэчаскага манастыра — частка левай рукі святой Марыі Магдаліны, якая захоўвае цяпло чалавечага цела.

«Святая роўнаапостальная міраносіца Марыя Магдаліна, у гонар якой асвячоны наш храм, з дзяцінства пакутавала на цяжкую духоўную хваробу... Гэта была сапраўдная хвароба, а не маральная сапсаванасць, — тлумачыць протаіерэй Мікалай Мар'янскі, клірык Мінскага Свята-Марыі-Магдалінінскага храма. — Трэба ведаць, што святая Марыя Магдаліна і евангельская грэшніца — гэта розныя асобы».

Пасля таго, як Хрыстос вылечыў Марыю з палесцінскага горада Магдалы, што на беразе Тыверыядскага (Галілейскага) возера, яна ніколі не пакідала свайго Настаўніка. Разам з Прасвятой Багародзіцай і апосталам Іаанам яна стаяла ля Крыжа і бачыла пакуты і смерць Ісуса. Яна апярэдзіла жанчын-міраносіц, калі прыйшла да пахавальнай пячоры на трэці дзень пасля распяцця і ўбачыла яе пустой... Ёй, спакутаванай горам, раней за астатніх явіўся ўваскрэслы Хрыстос. Марыя Магдаліна стала першым чалавекам, хто прамовіў фразу, якую вось ужо амаль 2000 гадоў паўтараюць з радасцю хрысціяне: «Хрыстос уваскрэс!»

«Хрысціяне вучацца ў гэтай святой любові да Госпада, набожнаму жыццю па Яго запаветах», — кажа айцец Мікалай.

Святая Варвара нарадзілася амаль на 3 стагоддзі пазней за Марыю Магдаліну на тэрыторыі сённяшняй Сірыі. Яна пацярпела за сваю веру ад рук уласнага бацькі-язычніка. Гэтую святую вернікі просяць аб заступніцтве, каб пазбегнуць раптоўнай смерці без пакаяння і прычашчэння Святых Тайнаў.

Згодна з правілам, якое дзейнічае на Афоне, святыні з манастыроў выносіць дазваляецца толькі раз на год. Прынясенне ў Беларусь гэтых хрысціянскіх рэліквій стала магчымым дзякуючы ініцыятыве брацтва ў гонар святіцеля Мікалая пры Свята-Марыі-Магдалінінскай царкве Мінска, звароту Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта і бласлаўленню Усяленскага Патрыярха Варфаламея.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

САВУК-ЛУТОК ХОЧА ГНЕЗДАВАЦЦА!

Вясковыя школьнікі дапамагаюць менеджару праекта ПРААН/ГЭФ «Біяразнастайнасць» Уладзіміру КАЎТУНОВУ ўстанаўліваць інфармацыйны шчыт.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тут гняздуецца некалькі чырвонакніжных відаў, найбольшую трывогу з якіх сёння ўяўляе папуляцыя лутка — маленькай качкі, якая гняздуецца ў дуплах дрэў. Больш нідзе ў Беларусі гняздоўяў лутка не выяўлена, а пачынаючы з 1998 года, з 22 пар гэтага віду на сёння зафіксавана не больш за 5 пар. На думку навукоўцаў-арнітолагаў, гэта ўжо тая крытычная мяжа, якую нельга пераходзіць. Прычын, якія спрыяюць рэзкаму змяншэнню папуляцыі качкі-дуплянкі, некалькі. Гэта і адсутнасць на берагавой азёрнай лініі дуплістых дрэў, і прымяненне гербіцыдаў у барацьбе з раслінасцю, і гібель ад куніц, і адвечнае суперніцтва за дуплы з больш моцнай качкай-гогалем. Але галоўнае, на думку спецыялістаў, паводзіны людзей у дачыненні да птушак, якія абралі для сябе гэты вадаём. У псіхалогіі мясцовых жыхароў дагэтуль пераважае стрэрэатыпнае мысленне, што большасць тутэйшых птушак шкоднікі, і з імі трэба весці барацьбу. І таму тут увесь час шкодзяцца штучныя дуплянкі для луткоў, якія штогод майструюць і развешваюць арнітолагі. Нават сёлета з трох дзясяткаў прымацаваных на вышыні 3-5 метраў птушыных дуплянак у трох ужо былі адбітыя дахі.

Арнітолаг Нацыянальнай акадэміі навук Павел ПІНЧУК змайстраваў і развесіў каля трох дзясяткаў дуплянак.

У час акцыі ўсталявання ахоўных аншлагаў і развешвання новых дуплянак да мясцовых школьнікаў звярнуўся галоўны беларускі знаўца гэтага віду птушак, вядомы арнітолаг Аляксандр Казулін з просьбай дапамогі ў ахове лутка. Бо і савук-луток, і іншыя птушкі маюць права на жыццё.

Шмат лутковых хатак для развешвання ў ваколіцах «Белага» выраблены непасрэдна рукамі арнітолагаў Паўла Пінчука і Івана Багдановіча. У будучыні вырабам іх зоймуцца самі школьнікі. А падчас акцыі вучням даверылі пранесці дуплянкі да магутнага дуба на самым ускрайку рыбгасаўскай сажалкі. Колькі было радасці і гонару! І спадзяванняў, што неўзабаве гэтыя хаткі знойдзе і зойме парачка луткоў-чырванакніжнікаў. І не адна.

Сваю прыродаахоўную акцыю ў «Белым» удзельнікі прымеркавалі да Міжнароднага дня Маці-Зямлі. Зямлі, на якой павінна быць месца ўсім.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.
Жыткавіцкі раён.

На адным з дубоў-патрыярхаў луток займее сабе надзейны дах.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДАВОЛІ ЦЁПЛА, АЛЕ З ДАЖДЖАМІ

На гэтыя працяглыя выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітаюць цёплыя паветраныя масы з боку Чорнага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. Таму ў суботу, нядзелю і панядзелак будзе вільготна, бо ўначы ў асобных раёнах, а ўдзень амаль паўсюдна чакаюцца дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература ўначы ў нядзелю і панядзелак плюс 6—12, удзень — 13—20 цяпла. Кароткачасовыя дажджы і навальніцы будуць назірацца месцамі і ў аўторак.

Сяргей КУРКАЧ.

У ПАЛІКЛІНІКАХ У ПАНЯДЗЕЛАК БУДЗЕ... СУБОТА

У сувязі з пераносам рабочага дня з 23 на 28 красавіка Міністэрства аховы здароўя ўнесла змяненні ў графік работы ўстаноў аховы здароўя. Амбулаторна-паліклінічныя арганізацыі будуць працаваць 21 красавіка — па графіку суботы, 22 красавіка — па графіку выхаднога дня, 23 красавіка — па суботнім графіку, 24 красавіка — па святочным графіку, 28 красавіка — па графіку рабочага дня і 29 красавіка — па графіку выхаднога дня. Работа бальнічных устаноў аховы здароўя будзе арганізавана наступным чынам: 21 і 28 красавіка — па суботнім графіку, 22 і 29 красавіка — па графіку выхаднога дня, 24 красавіка — па святочным графіку, а 23 красавіка ў бальнічных установах будзе звычайны працоўны дзень.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КРЭДЫТНЫ РЭЙТЫНГ БЕЛАРУСІ ПАЦВЕРДЖАНЫ

Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standard & Poor's пацвердзіла доўгатэрміновы суверэнны рэйтынг нашай краіны, прызнаўшы што эканоміка Беларусі стабілізуецца, і палепшыла прагноз па ім з негатыўнага да стабільнага. А вось стабільнасці курсу нацыянальнай валюты пакуль не відаць. Беларускі рубель працягвае ўмацоўвацца. За гэты тыдзень долар стаў таннейшы на 30 рублёў (мінус 0,4%) да 8000. Еўра знізіўся на 70 рублёў (мінус 0,7%) да 10510. «Расіянін» пазбавіўся 1,5 рубля (мінус 0,6%) і цяпер каштуе 271 рубель.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

КАЛІ ВЫ САБРАЛІСЯ НА ЭЛЕКТРЫЧКУ...

Як будуць курсіраваць прыгарадныя цягнікі ў святочныя дні? Ці з'явяцца ў раскладзе дадатковыя электрацягнікі? У Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі паведамілі, што на ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Асіповічы, Мінск — Баранавічы, Мінск — Орша яны будуць хадзіць наступным чынам: 21, 28 красавіка — як па суботах, 22-24 красавіка — як па нядзелях. У Маладзечанскім вузле расклад руху 21-24 і 28 красавіка будзе адпавядаць графіку выхадных дзён. Гэтак жа сама і ў названыя дні будуць курсіраваць прыгарадныя цягнікі на ўчастку Орша — Лепель. Што да дадатковых электрацягнікоў, у апошняй дэкадзе красавіка іх павінна з'явіцца ў раскладзе каля двух дзясяткаў. У той жа час на працягу 21-24 і 28 красавіка крыху меншая іх колькасць будзе адменена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ ДА «ВОБЛАКА СЦВЯРДЖАЛЬНЫХ ДУМАК»!

У Беларусі стартавала інтэрнэт-акцыя, прысвечаная 26-гадавіне чарнобыльскай катастрофы. Прыняць удзел у акцыі «Воблака сцвярджальных думак» можна на сайце www.rbic.by з 20 па 30 красавіка. Для гэтага дастаткова адказаць на пытанне «Што для вас значыць адраджэнне пацярпелых тэрыторый?». Адказ хутка з'явіцца ў вялікім воблаку сцвярджальных думак, якое праплывае над жывапіснымі помнікамі прыроды, архітэктуры і культуры 21 пацярпелага раёна Беларусі.

— Праект рэалізуецца ў межах мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, — адзначыла спецыяліст сектара камунікацый і аналізу інфармацыі Беларускага аддзялення расійска-беларускага інфармацыйнага цэнтра па праблемах наступстваў катастрофы на ЧАЭС МНС Беларусі Ганна КУЗЬМЯНКОВА. — Мы спадзяёмся, што інтэрнэт-акцыя прыцягне ўвагу шырокай грамадскасці да праблем сучаснага постчарнобыльскага перыяду і згуртуе беларусаў на адраджэнне пацярпелых рэгіёнаў.

Надзея ДРЫЛА.

ЯШЧЭ 5 БЕЛАРУСАЎ СТАЛІ ПРАВЕДНІКАМІ НАРОДАЎ СВЕТУ

У Мінску адбылася цырымонія, прысвечаная Дню катастрофы і генацыду еўрапейскага яўрэйства, арганізаваная Ізраільскім культурным цэнтрам. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Іосіф Шагал уручыў 5 новых дыпломаў Праведнікаў народаў свету беларусам, якія выратоўвалі яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны. На жаль, час няўмольны, таму ўзнагароды з рук пасла прымалі сваякі і родныя Раісы і Пятра Калейнікавых, Таццяны і Казіміра Мацкевічаў, Алены і Валянціны Ціхановічаў, Броні Бабровіч, Барыса Мацюкова, Варвары і Міхаіла Янушэвічаў.

Праведнікам уручаецца імянны медаль і ганаровы дыплом. Іх імёны заносяцца на Сцяну гонару ў Садзе Праведнікаў народаў свету на тэрыторыі музея Яд Ва-Шэм, у гонар кожнага саджаецца дрэва. Больш за 700 грамадзян Беларусі ўдастоены звання «Праведнік народаў свету».

Ігар ШЛАПАК.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ЗСКА» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже здания специализированного иного назначения (КПП 6), об.пл. 30,6 кв.м, инвентарный номер: 500/С-54551, расположенного по адресу: **г. Минск, ул. Лещинского Ю.М., д. 8/5. Начальная цена с НДС – 300 000 000 бел.руб.** Площадь земельного участка – **0,0440 га** (предоставлен продавцу на праве аренды по 28.02.2051. Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,005 га); **0,0012 га** (предоставлен продавцу на праве аренды по 28.02.2022. Ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения и теплоснабжения). **Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **22.05.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.05.2012** до 17.00 по указанному адресу. **Тел: (8017) 224-61-34; 500-47-12.**

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Миноблавтотранс» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Клецкий район, г. Клецк, ул. Привокзальная, д. 3,** в составе: производственное здание (инв. № 641/С-9175), об.пл. 2115,2 кв.м; административно-бытовое здание (инв. № 641/С-9176), об.пл. 2026,8 кв.м; здание мастерской (инв. № 641/С-9177), об.пл. 1071,9 кв.м; здание мастерской (инв. № 641/С-9178), об.пл. 1210,9 кв.м; ж/б ограждение (инв. № 641/С-10863); здание котельной (инв. № 641/С-11123), об.пл. 126,3 кв.м; ограждение из металлической сетки (инв. № 641/С-11124); асфальтобетонное покрытие (инв. № 641/С-11126), об.пл. 2523 кв.м. **Начальная цена с НДС – 3 701 707 146 бел. руб.** Площадь земельного участка – 5,2783 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования). **Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **25.05.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.05.2012** до 17.00 по указанному адресу. **Тел: (8017) 224-61-34; 500-47-12.**

Даеш Каны!

На «Залатую пальмавую галіну» Канскага кінафестывалю прэтэндуе фільм паводле Васіля Быкава

Днямі абвясцілі праграму 65-га Канскага кінафестывалю, аднаго з найбуйнейшых кінафестываляў у свеце, які пройдзе на французскім Лазурным беразе з 16 па 27 мая. 22 карціны з усіх куткоў свету будуць змагацца за галоўны прыз. Сярод іх — фільм «У тумане» ўраджэнца Беларусі Сяргея Лазніцы, які цяпер жыве ў Берліне. Сяргей Уладзіміравіч атрымаў дазвол на экранізацыю аповесці ў самога Васіля Быкава яшчэ ў 2001 годзе. Але лёс склаўся так, што першым іграваым фільмам гэтага рэжысёра-дакументаліста стала стужка «Шчасце маё», якая атрымала гран-пры на кінафестывалі «Лістапад» у 2010 годзе і якая таксама брала ўдзел у асноўным конкурсе Канскага кінафестывалю.

Сусветна вядомы кінарэжысёр Сяргей ЛАЗНІЦА родам з Баранавічаў.

«У тумане» — экзістэнцыйная драма. Дзеянне фільма адбываецца ў акупаванай немцамі Беларусі ў 1942 годзе. Галоўны герой Сушчэня (якога грае беларускі акцёр Уладзімір Свірскі) стаіць перад надзвычай складаным маральным выбарам. Сушчэню лічаць здраднікам...

Бюджэт фільма склаў прыблізна 2 мільёны еўра. Здымкі праходзілі ў Латвіі і цягнуліся 28 дзён. У міжнародным кінапраекце ўзялі ўдзел 5 краін: Германія, Расія, Латвія, Нідэрланды і Беларусь, якую прадстаўляў «Беларусьфільм». Таму для краіны гэта ўнікальны прыклад супрадукцыі, якая, калі нам пашчасціць, прыцягне ў айчыннае кіно інвестараў і, магчыма, нават рэжысёраў з сусветным імем (не ўхмыляйцеся скептычна, дайце памарыць!). І тое, што лагатып нацыянальнай кінастудыі з'явіцца на адным з галоўных кінаэкранаў свету — вельмі ганарова для нашай пакуль беднай на вялікія кінематаграфічныя перамогі краіны. Правы на сусветны продаж карціны, дарэчы, належаць вядомай кампаніі The Match Factory. Гэта разам з удзелам у буйных кінафестывалях можа гарантаваць фільму «У тумане» паспяховы пракатны лёс — што яшчэ пашырыць геаграфію распаўсюджання не толькі лагатыпа «Беларусьфільма», але і некаторых імёнаў беларускіх акцёраў і, магчыма, абудзіць у свеце інтарэс да нацыянальнай беларускай літаратуры.

Разам з фільмам рэжысёра з Баранавічаў у асноўнай праграме Канскага кінафестывалю ўдзельнічаюць стужкі вельмі самавітых сур'ёзных рэжысёраў: Алена Рэнэ, Леа Каракса, Жака Адзіяра, Міхаэля Ханеке, Ульрыха Зайдля, Кена Лоўча, Абаса Кіярастамі і інш. Што чакае стужку з «беларускімі каранямі»? Пра гэта пакуль цяжка казаць. Але калі ўлічваць агульнафестывальную кан'юнктуру, то цалкам верагодна, што без прыза Лазніца не застанецца.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Нясвіж пачуе Барыса Беразоўскага

Упершыню выдатны піяніст выступіць у сёлетняй «культурнай сталіцы» Беларусі

Адбудзецца гэта ў рамках другога фестывалю Уладзіміра Співакова ў нашай краіне, які будзе доўжыцца цэлы тыдзень. Ён дасць магчымасць паслухаць расійскіх музыкантаў і спевакоў, імёны якіх вядомыя ў свеце, а таксама пазнаёміць з беларускімі музычнымі надзеямі, такімі — як флейтыстка Юлія Шчасновіч, лаўрэат міжнароднага фонду імя Співакова, якая выступіць у адным з канцэртаў.

Учора, 20 красавіка, на адкрыцці фестывалю ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі выступілі зоркі сусветнай опернай сцэны разам з Нацыянальным філарманічным аркестрам Расіі пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Уладзіміра Співакова. У якасці замежнай «зоркі» прыехаў у Беларусь вучань Лучана Паваροці Іван Магры, голас якога гучыць у тэатрах Рыма, Балоньі, Генуі. Але па волі арганізатараў зала опернага тэатра можа ператварыцца ў кінатэатр, дзе дэманструюцца нямыя фільмы 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Нічога дзіўнага: «Агні вялікага горада» Чарлі Чапліна будзе ісці пад суправаджэнне расійскага аркестра, якім будзе дырыжыраваць Співакоў.

Аднак потым Нацыянальны філарманічны аркестр Расіі разам з маэстра едзе па Беларусі: у Гомель, Магілёў. Да іх далучыцца выдатны піяніст Барыс Беразоўскі, якога аматары музыкі ў Беларусі добра ведаюць. Аднак замест сталіцы краіны піяніст 25 красавіка павінен даць канцэрт у «культурнай сталіцы» — горадзе Нясвіжы, у старажытным палацавым комплексе.

Затое сталічных жыхароў 23 красавіка ў філармоніі чакае не менш прыкметная сустрэча — з аўстралійскім гітарыстам-віртуозам Томі Эмануэлем. Чатыры з яго альбомаў сталі залатымі ці «плацінавымі». Запісвацца і выступаць з музыкантам пажадалі зоркі сусветнай музыкі. Сярод іх, напрыклад, Ціна Цёрнер і Стыві Уандэр. Аднак сам Співакоў у Мінск яшчэ вернецца: будзе саліраваць на скрыпцы ў канцэрце з аркестрам «Камерата Зальцбург». Якую музыку прапануе нам аркестр, які прыехаў з роднага горада Моцарта?.. 26 красавіка будзе вечар Моцарта. І на закрыццё: думкі пра будучыню. Таму што разам са славутымі «Віртуозамі Масквы» 28 красавіка выступяць стыпендыяты Міжнароднага дабрачыннага фонду Співакова, маладыя музыканты, якія ўжо звярнулі на сябе ўвагу ў музычным свеце дзякуючы паспяховым выступленням на міжнародных конкурсах.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Ведай нашых!

Беларускі скрыпач Арцём Шышкоў атрымаў чарговую высокую адзнаку прафесіяналаў. Ён стаў лаўрэатам трэцяй прэміі міжнароднага конкурсу скрыпачоў і альтыстаў Макса Росталя ў Берліне. У свой час на маладога беларускага музыканта звярнуў увагу Уладзімір Співакоў падчас аднаго з міжнародных конкурсаў.

Цяпер Арцём Шышкоў, які скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, вучыцца ў аспірантуры пры Венскім універсітэце музыкі і выканальніцкіх мастацтваў. Аднак на музычных конкурсах прадстаўляе Рэспубліку Беларусь. Гэтым разам ён іграў на скрыпцы Андрэа Гварнэры, якую наша краіна набыла для маладых таленавітых музыкантаў — у тым ліку для іх выступленняў на міжнародных конкурсах.

ЗВЯЗДОЎСКІ СУБОТНІК

Ён для маладых супрацоўнікаў нашай газеты пачаўся ў пятніцу. Прыбіралі тэрыторыю і ўскладалі кветкі каля помніка на вуліцы Кульман, на месцы, дзе знаходзіўся дом падпольшчыцы Таццяны Якавенка, у якім летам 1942 года друкавалася «Звязда».

Дарэчы, цікавая асаблівасць: газеце больш гадоў, чым усім журналістам, што прысутнічаюць на фота. «Звяздзе» ў гэтым годзе — 95, а ў нас на чацвярых набралася крыху больш за 80 гадоў.

Фота Марыны БЕГУНОВАЙ.

На здымку: Вераніка КАНЮТА, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Ганна ГАРУСТОВІЧ, Ніна ШНАРБАЧЭВІЧ.

Пра даўнія часы ўспаміны Марыі Янаўны — удавы паэтавага брата.

ЗОРКА ПАЭТА Ў НЯБЁСАХ АЙЧЫНЫ

2012 ГОД КНІГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Велічны дуб над старою хаціной высіцца, нібы трымае на магутных плячах малады вясновы блакіт. Сёлетняя вясна ў вёсцы Пількаўшчына падаецца такой, як і ва ўсе часы: зніклі сумёты, адспявалі ручаіны, прылётныя птахі абжываюць гнездзішчы. Сто вёснаў таму ў вясковай хаце пад гэтым жа старым дубам чакалі нараджэння дзіцяці.

Нарадзіўся Максім Танк на Мядзельшчыне сто гадоў таму. Сёння ў гэтым азёрным краі многія памятаюць свае сустрэчы з песняром, калі ў апошнія гады свайго жыцця ён наведваў родны кут.

Усе, хто прымаў удзел у акцыі «Шляхамі паэтаў», мелі магчымасць чуць успаміны, распаведы яго землякоў. Не толькі галасы сучаснікаў, але і голас самога песняра гучаў у зале Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма Танка: захаваўся фонаспіс, каштоўны дакумент гісторыі гэтага краю, усёй гісторыі Беларусі.

Сумесная акцыя «Шляхамі паэтаў» сабрала на сустрэчу мядзельскіх літаратараў, краязнаўцаў, работнікаў культуры і адукацыі. Перад пачаткам пасяджэння «круглага стала» супрацоўнікі бібліятэкі віталі гасцей літаратурнай кампазіцыяй з вершаў Максіма Танка. Прысутныя мелі магчымасць пазнаёміцца з выстаўленымі тут шматлікімі фотаздымкамі, копіямі дакументаў і рукапісаў. А калі пачалося само пасяджэнне, усе пачулі цікавыя гістарычныя і літаратурныя агляды, выступленні мясцовых паэтаў. Асабліва цёпла сустрэлі выступленне члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Рагнеда Малахоўскага, які вырас у гэтых мясцінах і заўжды натхняўся творамі свайго славутага земляка.

Нарачанскі край стаў крыніцай натхнення не толькі для Максіма Танка — у прамовах выступоўцаў прагучаў вялікі пералік імёнаў славутых землякоў. Памяць пра іх бераўліва захоўваецца. Што датычыцца бібліятэкі — тут шмат працуюць над пашырэннем электроннай базы звестак пра паэта і іншых вядомых творцаў, папаўняюць медыятэку рэдкіх фоназапісаў вершаў, пашыраюць картатэку крылатых выказванняў з твораў Танка. Пры бібліятэцы дзейнічае аб'яднанне самадзейных аўтараў «Медуніца».

Пралёг маршрут і праз вёску, дзе калісьці хадзіў у школу будучы народны паэт Беларусі. Сёння Сваткаўскую сярэднюю школу можна аднесці да ліку маленькіх: усяго сто трынаццаць дзетак наведваюць яе, але сузор'е талентаў тут вельмі прыкметнае. Канцэрт, які далі юныя артысты разам з дарослымі ўдзельнікамі самадзейнасці, можна параўнаць з яркай кветкай у сённяшнім вянку памяці пра песняра.

За некалькі кіламетраў ад месца, дзе сто гадоў таму нарадзіўся паэт, пад старымі соснамі знаходзіцца месца яго апошняга прытулку. Калі ўдзельнікі акцыі «Шляхамі паэтаў» прынеслі сюды кветкі — каля старых могілак да іх далучыліся пажылыя вяскоўцы. Пасля хвіліны маўчання зноў пачаліся агульныя ўспаміны пра земляка.

Гэтая памяць і прызнанне ў сэрцах розных пакаленняў — галоўная адзнака Творцы і Грамадзяніна.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

Радкі, напісаныя Максімам Танкам, адлітыя ў метал каля яго магілы.

У хаце, дзе нарадзіўся паэт.

ПАМІЖ РАДКАМІ ДАКУМЕНТАЎ

«Дарагі Янка!

Пісьмо тваё і тэлеграму атрымала! Я вельмі рада, што ты лечышся! Лячысь, папраўляйся! Навін у Пячышчы мала. Жудкая таска — пастата. У Наякшыных дома цяжка, вельмі цяжка! Не знавем, аб чым гаварыць. Што слышна ў нашых хлопцаў? Дзе ты быў, у якіх сваіх прыяцеляў. Шлю прывет тым, хто мяне хаця трохі памятае. Думаю, што такіх будзе мала. Перадаю просьбы:

1) Парыкмахершы — яна просіць табе напомніць купіць машынку для стрыжкі.

2) Зоі (буфетчыцы) купіць браслет для гадзінніка маталічны.

3) Тбаю (зам. дырэктара) — акуляры 2 стекла размер 3,5 ён вельмі просіць.

Калі ты думаеш прыехаць? Шлю шчырае прывітанне. Жадаю паправі цца, Владка...»

Вытрымка з ліста Уладзіславы Францаўны, жонкі Янкі Купалы. Адрас на канверце: «Москва. Гостиница «Москва». Комната № 414. Писателю Янке Купале».

Ліст, які застаўся без адказу. Але захаваўся ў гісторыі. Захаваўся ў архівах як сведчанне таго, што яго чакалі. І ён павінен быў вярнуцца, ужо хоць бы дзеля таго, каб выканаць просьбы іншых людзей.

Ліст гэты змешчаны ў зборніку дакументаў і матэрыялаў «Купала і Колас, вы нас гадавалі», укладальнікамі якіх сталі Вячаслаў Селяменеў і Віталь Скалабан. Дзве кнігі выйшлі летась. Значыць — своечасова. Таму што ёсць магчымасць у год звароту да спадчыны беларускіх класікаў адкрыць прычыны, можа, некаторых іх твораў альбо ўчынкаў. А яшчэ важна, каб сучасныя нашы суграмадзяне зразумелі: пісьменнікі са школьных падручнікаў былі жывымі людзьмі, якія жылі ў пэўных абставінах.

Такую магчымасць даюць якраз гэтыя зборнікі, лічыць **літаратуразнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась МУШЫНСКІ,** які быў галоўным рэдактарам гэтага выдання. Яго я распытваю пра тое, ці можна праз такія кнігі прыцягнуць увагу людзей да класікаў, каб іх чыталі і адкрывалі нешта новае — праз тыя ж архіўныя дакументы, якія друкуюцца ўпершыню.

— Я выступаў з дакладам пра гэтую кнігу на «Каласавінах» і, як навуковы рэдактар, выказаў меркаванне, што калі выйдзе трэцяя кніжка, то гэтая праца вартая таго, каб быць адзначанай высокай прэміяй. Гэта мая ацэнка вартасці гэтай кнігі.

Я сам выкарыстаў гэтыя матэрыялы ў «Летапісе жыцця і творчасці Коласа» — кнізе, якую рыхтую ў якасці юбілейнага выдання. Я даволі шчодра выкарыстоўваю цах, якія пазначаны).

— Такое выданне сведчыць: няма мяжы ведам...

— Так і ёсць! Чым гэта кніжка каштоўная? Яна дае нам сапраўды багаты новы матэрыял, новыя звесткі, новыя звесткі пра Купалу і Коласа. Бо раней працы, прысвечаныя ім, былі прыгладжаныя. Вострыя вуглы і канфліктныя сітуацыі старанна абыходзілі не толькі ў падручніках, а нават у сур'ёзных даследчых працах. Што ж, быў такі час, такая атмасфера, што мы не заўсёды асмельваліся, ды і ў нашым распараджэнні не так багата было матэрыялу такога кшталту. У гэтых кніжках такое багацце новых архіўных матэрыялаў, якія паказваюць, што творчае жыццё і творчасць саміх нашых класікаў была нашмат складанейшай, нашмат больш драматычнай, чым мы ўяўлялі. Сведчанне — тыя ж выклікі Коласа ў следчыя органы, каб ён даў паказанні супраць міфічнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі». Мы ведаем, што гэтай арганізацыі не існавала. Тым не менш, Колас вымушаны быў пісаць тлумачэнне. Яно было недастатковае. Тады яго падштурхнулі, каб ён напісаў паўторна, потым каб выступіў у друку з пакаянным лістом, дзе прызнаваў свае памылкі. Але як ён тыя памылкі прызнаваў? Вельмі высакародна сябе паводзіў: нікога не закладваў, не казаў, што ёсць такія ці сякія, нават калі нейкія людзі былі ўжо арыштаваны па гэтай справе. Ён прызнаваў віну ў тым, што калі працаваў у Акадэміі навук, то ні пісьмова, ні вусна не выкрываў «нацдэмаў», якія адводзілі навукоўцаў і літаратуру ад правільнага шляху. Зразумела, што ён вымушаны быў займацца самаагаворам.

— Верагодна, што на чалавека такога ўзроўню ціснулі. Але, магчыма, адкрылася нешта, што вас прыемна ўразіла?

— Багата матэрыялу, які паказвае не толькі негатыўныя і змрочныя фрагменты жыцця Коласа, але і тое станоўчае, што мы мала ведаем пра яго. Напрыклад, удзел Коласа ў канферэнцыях, у распрацоўцы праблем беларускай мовы, дыялекталогіі, выпрацоўка нормаў правапісу. Гэтага матэрыялу раней не было. Цяпер спецыялісты розных кірункаў могуць адкрыць пэўны аспект: мовазнаўцы, літаратуразнаўцы, гісторыкі. Гісторык рэлігіі, напрыклад, знойдзе матэрыял пра тое, як Колас хацеў царкву ў Беларусі бачыць больш беларускай. Потым яму часта ўспаміналі гэта. У выніку мы бачым аблічча самога Коласа, што ён намнога больш шматгранны не толькі як пісьменнік, але і як культурны і грамадскі дзеяч. Шэраг матэрыялаў датычаць яго публіцыстычных выступленняў. Гэтыя дакументы даюць вельмі многа літаратуразнаўству — у прыватнасці, узбагачаюць яго тым матэрыялам, які прымушае нас у новым ракурсе паглядзець на сам літаратурны працэс, на тое культурна-літаратурнае жыццё 20-30-х, 40-х гадоў.

Ёсць дакументы, звязаныя з правядзеннем юбілеяў Песняроў. Яны сведчаць, як беларускія літаратурныя і партыйныя арганізацыі, прадстаўнікі кіраўніцтва краіны звярталіся ў Маскву з просьбай дазволіць правесці юбілейны вечар, пісалі, хто павінен там быць дакладчыкам. Чытаеш — і бачыш, што гісторыя літаратуры, якую мы раней пісалі (я ў тым ліку) патрабуе абнаўлення. Гэтыя дзве кніжкі і трэцяя, якая падрыхтавана, паслужаць вельмі значнай справе грунтоўнага абнаўлення нашых ведаў, уяўлення пра літаратурны працэс, пра асабістае жыццё класікаў, пра іх грамадскую дзейнасць, культурную, навуковую. Няма мяжы той працы, якую зрабілі Віталь Скалабан і Вячаслаў Селяменеў як укладальнікі, і ўвесь калектыў, які меў дачыненне да выхаду кніг.

Наогул, заўсёды важныя любыя новыя звесткі, сведчанні. Мы цяпер набліжаемся да выдання поўнага збору твораў Якуба Коласа ў 20 тамах. На выхадзе 17 том. А раней было 16 тамоў. Дык дадатковыя 6 тамоў вельмі ўзбагачаюць ранейшае ўяўленне пра Якуба Коласа. Як пра пісьменніка, можа, і не істотна — новых твораў мы не знайшлі, каб яны карэнным чынам мянялі наша ўяўленне пра яго.

— Але ж для разумення творцы важныя яшчэ і яго чалавечыя ўчынкі?

— Гэтыя ўчынкі вельмі добра раскрываюцца праз лісты, праз публіцыстычныя артыкулы, часткова праз дзённік. Зараз усё друкуецца без купюр. Купюр, на жаль, было многа. Нейкія рабіліся складальнікамі ў 70-я, 80-я гады, нейкія падказваліся рэдактарамі выдавецтваў. Цяпер 20-томны збор твораў друкуецца ў максімальна поўным аб'ёме, з вялікімі навуковымі каментарыямі і паслясловамі. Я меў гонар напісаць прадмову да гэтага збору твораў у 20-ці тамах, яна змешчана ў першым томе і называецца «Свайму часу і вечнасці». Два гэтыя словы раскрываюць агульную мэтаўстаноўку, якую мы як складальнікі і я як адзін з кіраўнікоў гэтага праекта ставілі перад сабой. Паказаць, што Колас зрабіў для свайго часу і які ўклад яго ў сусветную літаратуру. Аказалася, што трэба яшчэ і пасляслоўе пісаць, асабліва для такіх складаных твораў, як «Адшчапенец», «На шляхах волі», да публіцыстыкі, да літаратурнай крытыкі... У каментарыях якраз і тлумачыцца, чым было выклікана з'яўленне такога артыкула, як «Рэформа правапісу і фашысцкія музыкі». Альбо артыкул «Слон і моська» — водгук на вайну Савецкага Саюза і Фінляндыі. Трэба патлумачыць, якімі абставінамі — псіхалагічнымі, грамадска-палітычнымі — гэта выклікана. Бо мы хочам паказаць Коласа такім, якім ён быў. Каб ён паўставаў у свядомасці чытачоў у больш аб'ектыўным асвятленні, без паляпшэння і без крытыканства. Бо нам патрэбны аналіз і аб'ектыўная ацэнка зробленага Коласам як творцам і як чалавекам. Мы прызнаём і паказваем, што ён вымушаны быў часта пагаджацца з нечым, ісці насуперак сваім перакананням. Але гэтым не закрэсліваецца яго роля як вядучага аўтарытэтнейшага пісьменніка ў беларускай літаратуры, як аўтара бессмяротнай «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі», «Казак жыцця» і так далей.

— Шмат хто цікавіцца жыццём Купалы і працягвае чакаць раскрыцця галоўнай таямніцы яго смерці. На вашу думку, ці будзе наогул магчымасць пра гэта даведацца? Ці могуць з'явіцца дакументы, якія пакажуць сутнасць таго, што адбылося ў атэлі «Масква»?

— ...Зойдзем з другога боку. У 1943 годзе Якуб Колас выступіў з артыкулам, дзе казаў пра тое, што ніякіх перамоў з Гітлерам не можа быць, што нікому не ўдасца разрэзаць надвае жывое беларуска-ўкраінскае цела. Хто хацеў разрэзаць цела Беларусі і Украіны?.. Няма звестак пра гэта. Калі тут быў кіраўнік Федэральнага архіўнага агенцтва Расіі, я задаў яму пытанне: як нам гэта тлумачыць? І ён сказаў, што ніякіх матэрыялаў аб сепаратных перагаворах Савецкага Саюза з Гітлерам няма. Але ж Колас не мог гэтага выдумаць. Значыць, былі нейкія чуткі. Магчыма, гэта адбылося «дзякуючы» нямецкай контрразведцы, магчыма, была дэзынфармацыя. Колас, які быў цесна звязаны са славянскім камітэтам, мог чуць нейкія такія размовы, у якіх праводзілася лінія, што частка Беларусі і Украіны адыходзіць Германіі. Больш за тое, у 1943 годзе польскі ўрад Сікорскага ў Англіі выступіў з такой прапановай: маўляў, мы не будзем падымаць пытанне пра Катынь, але вы пагадзіцеся з тым, каб мяжа лічылася па 1939 годзе. Натуральна, што Колас мог абурыцца: гэта ж беларуская зямля. Мы такія словы павінны былі каментаваць, як разумеем. Але матэрыялаў, як сказаў расійскі архівіст, у архівах не знойдзена...

Ці будзе знойдзены які дадатковы матэрыял у далейшым, цяжка сказаць. Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч, якому прысвечана мая кніжка як пачынальніку «Каласавін», лічыў, што не было сэнсу розным уплывовым сілам учыняць дыверсію — знішчаць Купалу. Бо пісаў ён так, як патрабаваў час: заклікаў біць гітлераўцаў паганых. Больш за тое, ёсць матэрыял (ён таксама змешчаны ў кнігах «Купала і Колас, вы нас гадавалі») пра тое, як акупацыйныя ўлады забаранялі друкаванне твораў Купалы і Коласа савецкага перыяду, але мясцовыя прадстаўнікі самакіравання прасілі змяшчаць у школьных падручніках дакастрычніцкія творы Купалы і Коласа з тлумачэннем, што яны сапраўдныя беларускія, а тыя, што пазней — няправільныя. І гэты матэрыял таксама працуе на абнаўленне вобразаў Купалы і Коласа ў свядомасці беларусаў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

МУЗЫЧНЫ ТЭАТР АДНАЎЛЯЕ ДОБРЫЯ САВЕЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ

Сёння ў сталічным Музычным тэатры адбудзецца гала-канцэрт, які завершыць міжнародны тыдзень музычнага мастацтва «Наталля Гайда запрашае». Усе квіткі на гэты вечар былі раскуплены больш чым за тыдзень да мерапрыемства. Канцэрт складаецца з двух аддзяленняў: балетны дывертысмент і вакальныя нумары. Усё гэта з удзелам запрошаных тэатральных «зорак».

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр праводзіць тыдзень музычнага мастацтва з удзелам музычных тэатраў Расіі, Азербайджана і Казахстана. Сярод удзельнікаў праекта — вядучыя артысты музычных тэатраў СНД. Упершыню наведала Мінск народная артыстка Расіі Галіна Пятрова, салістка Свярдлоўскага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, гастролі якога, дарэчы, плануюцца ў нашай сталіцы ў бліжэйшыя месяцы. З задавальненнем прыязджае да нас народны артыст Расіі Уладзімір Якаўлеў (Іркуцкі дзяржаўны музычны тэатр імя Загурскага). 4 гады таму Якаўлеў быў у Мінску на гастролях, і яго так цёпла прынялі мінскія тэатралы, што артыст ніколі не адмаўляецца ад запрашэнняў наведаць сталіцу Беларусі. Асаблівы для яго гонар — сыграць на адной сцэне разам з прымай беларускай аперэты Наталляй Гайдай. Прыехалі ў Мінск і маладыя артысты з розных гарадоў Расіі: Аляксандра Гарашчук, Андрэй Данілаў, Таццяна Клімава, а таксама азербайджанскія «зоркі» аперэты Інара Бабаева і Фарыд Аліеў. Варта адзначыць, што ўсе артысты пагадзіліся на ўдзел у беларускім праекце без ганарараў. Што сёння бывае, наогул, надзвычай рэдка. Значыць, ёсць яшчэ сапраўднае мастацтва, а мінская музычная сцэна працягвае прывабліваць прафесіяналаў.

— Ідэя такога фестывалю з'явілася спантанна. І ўсе вельмі ўзрадаваліся, — распавядае **Сусана ЦЫРУК, галоўны рэжысёр Беларускага акадэмічнага музычнага тэатра,** — Ні для каго не сакрэт, што пасля развалу Савецкага Саюза спыніліся штогадовыя традыцыйныя двухмесячныя ўзаемагастролі саюзных тэатраў. І ўжо цэлае акцёрскае пакаленне наогул не ведае, што гэта такое — «людзей паглядзець і сябе паказаць». Засталіся адзінкавыя тэатры ў краіне, якія дазваляюць сабе выехаць на вялікія гастролі. А тое, што ў спектаклях побач з нашымі акцёрамі з'яўляюцца запрошаныя, толькі дадае свежасці, навізны. Новыя партнёры, рэакцыі, мізансцэны. Заўжды прысутнічае элемент нечаканасці, таму што за дзве рэпетыцыі акцёры не могуць так «прыцерціся» адно да аднаго.

Фота Анжалікі ГРАКОВІЧ.

Сцэна са спектакля «Бабін бунт».

Беларускія гледачы мелі магчымасць убачыць чатыры звыклыя спектаклі ва ўнікальным паўімправізацыйным выкананні: «Бабін бунт» Я. Пцічкіна, «Аршын мал алан» У. Гаджыбекава, «Сільва» І. Кальмана, «Граф Люксембург» Ф. Легара.

Цікава, што тыдзень музычнага мастацтва — гэта не толькі спектаклі, але і майстар-класы, творчыя сустрэчы і нават «круглы стол» па пытаннях тэатральнага менеджменту. Так што Наталлі Гайдзе ўдалося арганізаваць, па сутнасці, сапраўдны тэатральны форум. Спадзяёмся, ён будзе квітнець і ўдасканальвацца.

— Мы хочам паказаць, што мы ўсё можам арганізаваць самі на прафесійным узроўні, — распавядае **мастацкі кіраўнік мінскага Музычнага тэатра Адам МУРЗІЧ**. — І магчыма, у наступны раз у нас з'явяцца і спонсары, і дзяржаўная падтрымка.

А што тычыцца гастроляў і абмену творчым вопытам... У чэрвені на 25 дзён у Мінск з гастролямі прыедзе Екацярынбургскі тэатр музычнай камедыі. Аматары аперэты — танцуйце!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

КУЛЬТУРНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

95 ЗВЯЗДА

Спачатку сумнявалася, ці даваць такі загаловак падборцы, зробленай на аснове падшыўкі за 1928 год. Усё ж на старонках «Звязды» таго часу не столькі апісваецца культурнае жыццё, колькі аўтары выказваюць свае думкі наконт таго, якім яно павінна быць. Але чаму не? Калі ў сваіх матэрыялах аўтары так часта пішуць пра тое, чаго ім не хапае, абураюцца тым, што ёсць, выказваюць свае прапановы наконт таго, як змяніць усё да лепшага, хіба гэта не сведчыць пра жаданне змяніць існуючы парадак рэчаў, зрабіць скачок у «светлае» будучае?

«МАЛАКУЛЬТУРНАСЦЬ» ПЕРАШКАДЖАЕ ЭКАНОМІЦЫ

«За культурную рэвалюцыю» — пад такім загалоўкам выйшаў артыкул Вільгельма Кнорына 21 студзеня 1928 года. Аўтар непакоіцца за якасць прадукцыі, што вырабляецца народнай гаспадаркай БССР, і выказвае думку, што «культурная рэвалюцыя ідзе не толькі праз школу, навуку, мастацтва, але праз культуру штодзённай працы»:

«Наша малакультурнасць з'яўляецца перашкодай для ўздыму нашай эканомікі... Возьмем пару прыкладаў. Мы значна развілі нашу жывёлагадоўлю, але ў той жа час мы для ўнутранага спажывання ўвозім мяса з РСФСР і Украіны. Чаму? Таму, што наша скаціна дрэнная якасці, таму што наша мяса горшае за расійскае і ўкраінскае. Ці ж у гэтым маленькім пытанні не цэлая культурная праблема? Праблема перабудовы нашай жывёлагадоўлі — праблема вышэйшай пароды скаціны, праблема культурнага догляду жывёлы...

Мы заахвочваем на Віцебшчыне і Полаччыне льнозаводства і ў той жа час лічым якасць нашага льну нізкай.

Мы не ўлічваем таго, што рацыяналізацыя нашай прамысловасці, барацьба за зніжэнне сабекошту, за зніжэнне накладных выдаткаў і ёсць вялізная культурная праблема...»

Але пачынаючы з эканамічных, аўтар пераходзіць на іншыя пытанні:

«Мы затрачваем значныя сродкі на друк, на газету, на кнігу. Але мы яшчэ далёка не дабіліся таго, каб кожны пісьменны — а іх меншая палова насельніцтва — чытаў нашу газету, нашу кнігу. Тыражы нашых газет мізэрныя... Сорам і ганьба для ўсіх нас, для нашых вясковых работнікаў, якія, відавочна, яшчэ не зразумелі ролі газеты, што газета з'яўляецца асноўнай зброяй культурнай рэвалюцыі ў вёсцы. А ці ж не сорам і ганьба, калі цэнтральны орган нашае партыі «Звязда» разыходзіцца толькі ў 9.000 экз.? Дзе тут разуменне задач культурнае рэвалюцыі, дзе тут разуменне рашучай, буйнейшай ролі друку ў справе арганізацыі сацыялістычнага грамадства? Дзе работа па арганізацыі распаўсюджвання газет з боку рэдакцый, партарганізацый, саветаў? А возьмем кнігу. Мы мала, надзвычай мала выдаём для вёскі. Мы больш забяспечваем кнігаю культурную верхавінку. Мала клапоцімся аб рабочым, бедняку-селяніне, аб сялянскай моладзі...»

ЧАЙНАЯ ЗАМЕСТ ПІЎНУШКІ

Даволі часта газета піша пра клубы. Але калі адны аўтары проста дакладаюць, якая праца наладжана, другія выказваюць незадаволенасць: «мала рабочых у клубах», «у клубе сумна, памяшканні не прыстасаваны», пішуць, што гэтыя ўстановы маленькія і не могуць прыняць усіх. У студзені 1928-га на гэтую тэму выходзяць не толькі асобныя матэрыялы, а цэлыя падборкі тэкстаў. У адной з іх аўтары пішуць, што рабочаму няма куды пайсці, у інтэрнаце ён не можа адпачыць, «бо недзе павярнуцца», «парадкі кепскія, дае знаць аб сабе і распуста» «Застаецца адзіны шлях — піўная... Там можна адпачыць за бутэлькай гадзіну-другую, забыцца, пагаварыць па душах, нават памарыць... аб лепшым, больш культурным жыцці. Але... бруднае пекла піўнушкі ня можа задаволіць запатрабаванні рабочага. Ён вырас, стаў больш свядомым. Ён жадае культурнага адпачынку».

На старонках газеты абмяркоўваецца і пытанне аб стварэнні савецкіх «чайных».

«Чыстая, светлая, з музыкай і газетамі чайная гасцінна змесціць... сям'ю рабочага, жонцы не прыйдзецца шукаць мужа на бруднай падлозе піўнушкі».

Але такім месцам адпачынку, на думку аўтараў, можа быць і клуб. Неабходна толькі паклапаціцца аб яго абсталяванні і змесце клубнай працы: «Патрэбны лекцыі і кіно. Неабходны часта і агіткі. Але паклапаціцеся і аб танным буфеце, скарыстайце самадзейнасць і актыўнасць клубнай масы... Рабочыя клуба цікавяцца лекцыямі на вытворчыя тэмы. Патрэбны пастаноўкі драматычнага гуртку і кінасеансы».

КЛУБ-СТАЛОЎКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У нарысе «Кветкі з бур'яну» Эм. Зарн распавядае пра «клуб-сталоўку» беспрытульных, дзе на працягу дня праводзяць час дзеці 3-16 гадоў:

«Толькі некаторыя з іх не маюць прытулку. Большасць начлег маюць у бацькі, мацеры ці каго-небудзь іншага. У дзень жа за імі глядзець няма каму. Зроблена абследаванне начлегу дзяцей... Жывуць у сырых, цёмных сутарэннях. У адных маткі жабруюць. У другіх — займаюцца зводніцтвам і прастытуцыяй. Некаторыя для гэтых мэт нават выкарыстоўваюць сваіх 10-12-гадовых дачок...»

Адна з дзяўчынак гэтага клуба прызнаецца, што бацькі ў яе няма, а маці зарабляе тым, што мые бялізну. Зарабляе дрэнна — есці няма чаго. Акрамя ежы, дзеці тут атрымліваюць і занятак. Нехта танцуе, іншыя вучацца рамантаваць і шыць абутак.

«У НАСТУПЛЕННЕ СУПРАЦЬ ГАРЭЛКІ!»

Пад такой назвай выходзіць падборка тэкстаў рабкараў за 9 жніўня. «З-за п'янства растуць прагулы, растраты, пашыраецца прастытуцыя», — абураюцца аўтары і патрабуюць узмацнення рэпрэсіўных мер па барацьбе з п'янствам. Яны прапануюць: спыніць продаж моцных напіткаў у дні палучак і свят, скараціць сетку магазінаў, якія гандлююць гарэлкаю, ліквідаваць піўныя ў рабочых раёнах, забараніць продаж піва ў клубах. У гэты час ствараюцца антыалкагольныя ячэйкі. Але рабкары шукаюць і іншыя падыходы да вырашэння гэтай праблемы, напрыклад, «стварыць клубы для алкаголікаў»: *«У такіх клубах можна было б наладзіць гутаркі, лекцыі аб уплыве гарэлкі на арганізм, дэманстраваць розныя часткі чалавечага арганізма, якія знішчаюцца пад дзейнасцю алкаголю. У клубах можна наладзіць карысныя гульні, пастаноўкі, арганізаваць паказальныя суды над злоснымі і непапраўнымі п'яніцамі, наладзіць конкурсы і спаборніцтвы на вытрымку, хто з членаў клуба на даўжэйшы час утрымаецца ад п'янства»*.

Калі пагартаць падшыўку за 1928 год і паглядзець, як часта ў ёй падаюцца падобныя матэрыялы, здаецца, што ў гэты час разгорнута цэлая кампанія супраць п'янства. Дарэчы, у адной з заметак знаходжу таму пацвярджэнне *«Барацьба з самагонаварэннем ва ўмовах Беларусі значна стражэйшая, чым у іншых рэспубліках саюзу. Гэта выяўляецца не толькі ў карнай палітыцы, але і ў заканадаўстве... У СНК прадстаўлены праект закону, згодна якога ўзмацняецца карная санкцыя супраць самагоншчыкаў. Унесены прапановы аб высылцы самагоншчыкаў з межаў іх месцажыхарства незалежна ад аддання іх суду»*.

Аўтары «Звязды» нават падлічылі страты (колькі краіна недаатрымоўвае прадуктаў), якія нясе краіна з-за самагоншчыкаў: *«Па прыблізных падліках.. па ўсёй Беларусі траціцца штогод на выганку самагону каля мільёну пудоў збожжа, бульбы, ячменю і інш»*...

«ПЕРАМОГА ТАЛЕРАК»

А ў тэксце з такім загалоўкам, змешчаным 1 мая, аўтары газеты змагаюцца ўжо... супраць «агульнай міскі»: *«Спрадвеку яна пануе ў вясковай хаце... Вакол яе збіраецца сялянская сям'я — старыя і маладыя, здаровыя і хворыя — і прагна цягнуцца драўляныя лыжкі, а часам і «няўзброеныя» брудныя пальцы да кашы... Хто ведае, колькі хвароб было перанесена ад адных членаў сям'і да другіх дзякуючы гэтай самай круглай місцы!*

Агітаваць за талеркі танныя кааперацыйныя — гэта пакуль не прыходзіць у галаву ніводнаму нашаму вясковаму барацьбіту за культуру. Але ўсё ж агітацыя ідзе... Агітацыя прыкладам. Яна ідзе ад нашых буйных камун і саўгасаў, дзе талеркі даўно ўжо атрымалі поўную перамогу над старой міскай».

КВАТЭРНЫЯ ПЫТАННІ

Калі гартаеш старыя падшыўкі, разумееш, што сучасныя праблемы ЖКГ — дробязі. *«У час царызму ўсе рабочыя і гарадская бедната жылі ў сутарэннях. Цяпер сутарэнні сталі перасоўнымі пунктамі, якія трэба ліквідаваць, бо пагражае небяспека туберкулёзу. Агульныя кухні разбураюцца з-за таго, што кожная гаспадыня ўзвальвае адна на другую і мыццё падлогі, і апал, і г.д. На кухнях сякуць дровы, над рукавінамі мыюцца і разліваюць ваду па ўсёй падлозе, ад чаго гніюць бэлькі і сцены, вада замярзае, трубы лопаюцца. Трэба адміністрацыйным парадкам ужываць рэпрэсіўныя меры супраць кватарантаў, якія нядбайна адносяцца да кватэрнай маёмасці»*.

Дарэчы, у гэтым годзе ў Мінску пачалося будаўніцтва «дамоў-гігантаў». Так, газета называе дамы на 70 і 120 кватэр.

«У Мінску да гэтага часу адбывалася пробнае кватэрнае будаўніцтва. Пры гэтым амаль на 90 працэнтаў драўлянае». Апісваецца, што будзе ўяўляць сабой новае жыллё. Так, у чатырохпавярховым доме на 70 кватэр будуць абсталяваны: «спецыяльная пральня, пакоі для душаў і склады для апалу, вялікі пакой для сходаў жыльцоў». Кватэры будуць складацца з 2-3 пакояў і ў кожнай — асобная кухня з невялікай кладоўкай—сценнай шафай.

ГУЛЯННЕ НА ВЁСЦЫ

Першым крокам «па шляху культурнай рэвалюцыі на вёсцы» газета называе новыя гулянні, што ладзяцца «без самагону, гарэлкі, куды запрашаюцца шэфы-рабочыя. Так, 1 жніўня 1928 года газета распавядае пра «народнае культурнае гулянне без папойкі і панажоўшчыны, сумесна з шэфамі», якое падрыхтаваў Барысаўскі райком КП(б)Б, як першую спробу ўжывання новых формаў масавай працы на вёсцы. Прычым гэта ладзілася гулянне сялян 20 вёсак.

ПРАБЛЕМА «ДВУХСПАЛЬНАГА ЛОЖКУ»

Адно з пытанняў, якое пастаянна абмяркоўваецца на старонках «Звязды»-1928, тычыцца кінематографа. У адным з тэкстаў пад загалоўкам «Які нам патрэбен кінафільм?» аўтар Канцэльсон выступае супраць «двухспальнага ложку». Ён лічыць, што стваральнікі фільмаў «стараюцца навязаць нікчэмнае і непатрэбнае для нашага гледача»: напружанне гледача і ўзбуджэнне яго эмацыянальных пачуццяў часта будуецца на «двуспальных ложках».

Востра стаіць праблема аб карцінах для моладзі і юнацтва. Пасля наведвання дэтэктыўных карцін ня рэдкія выпадкі наладжвання кулачных баёў з мэтаю падражання героям...»

РАБОЧЫЯ З ЗАЛАТЫМІ ЗУБАМІ

Публікацыі «Звязды» сведчаць і пра тое, як шмат было зроблена за 10 гадоў савецкай улады. Так, пад подпісам М.А. Поляк выходзіць матэрыял «Ад цемры да святла (назіранні і ўражанні старога ўрача)».

«Калі ж я цяпер праходжу міма клінік, інстытутаў, лабараторый, дыспансэраў, санаторыяў, дамоў адпачынку, дыетычных сталовак, міма ўстаноў аховы мацярынства і дзяцінства, як дзіцячыя бальніцы, радзільныя дамы, дамы груднога дзіцяці, кансультацыі, яслі, пляцоўкі і г.д., дык як не думаць аб тым, што 10 год таму назад ніхто гэтых назваў не ведаў, ніхто гэтых слоў не ўжываў...

Калі я бачу ў рабочага або работніцы рот з залатымі зубамі, калі я бачу інвалідаў, забяспечаных пратэзамі, блізарукіх — акулярамі, цяжарных жанчын — набрушнікамі і г.д, дык думаю: Кастрычнік ім даў тое, аб чым яны не марылі, але што ім было патрэбна».

Падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ЧЫМ БОЛЬШ ЛЕКАЎ, ТЫМ ЛЕПШ?

Важным рабочым інструментам для ўрача павінны стаць фармуляры лекавых сродкаў

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усур'ёзную медыцынскую, сацыяльную і эканамічную праблему ператварыліся ў апошнія гады ўскладненні ад лекавай тэрапіі. Напрыклад, у ЗША выдаткі, звязаныя з лекавымі ўскладненнямі, перавышаюць 70 мільярдаў долараў у год. У Германіі яны складаюць больш як 500 мільёнаў.

— Не толькі сярод насельніцтва, але і сярод большасці ўрачоў распаўсюджана памылковае меркаванне, што дазволеныя для прымянення ў медыцынскай практыцы лекавыя прэпараты ўсебакова вывучаны і іх эфектыўнасць поўнасцю адлюстравана ў інструкцыі, — дзеліцца сваімі думкамі з журналістам «Звязды» **старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў, галоўны ўрач 34-й сталічнай паліклінікі Дзмітрый ШАЎЦОЎ.** — Да моманту рэгістрацыі новае лякарства праходзіць выпрабаванні на абмежаванай колькасці хворых і ў даволі штучных умовах, калі выкарыстоўваюцца пэўныя крытэрыі падбору ўдзельнікаў выпрабаванняў, манатэрапія і гэтак далей. У выніку новы прэпарат прымаюць хворыя, якія маюць спадарожныя захворванні. Пры гэтым узрост пацыентаў, узаемадзеянне лекаў паміж сабой, а таксама з іншымі біялагічна актыўнымі рэчывамі і харчовымі прадуктамі могуць істотна змяняць як эфектыўнасць, так і пераноснасць лекавага прэпарата. Што тычыцца немаладых людзей, то для іх асабліва ўласцівыя праблемы са здароўем: каля 80 працэнтаў з іх церпяць ад аднаго ці некалькіх хранічных захворванняў і, як вынік, дастаткова часта прыбягаюць да лекаў. У Вялікабрытаніі і ЗША пажылыя людзі спажываюць да 30% усіх лекавых сродкаў, што там прадаюцца. У Італіі 40% людзей ва ўзросце пасля 70 гадоў штодня прымаюць ад чатырох да шасці найменняў лекавых сродкаў, а 12% — дзевяць і больш.

Сапраўдная бяспечнасць лякарства можа быць устаноўлена толькі ў шырокай медыцынскай практыцы. Можа прайсці не адзін год да ўстанаўлення сувязі паміж прыёмам пэўнага прэпарата і лекавым ускладненнем. Так, з моманту прымянення аспірыну прайшло шмат гадоў, перш чым была выяўлена яго здольнасць выклікаць крывацёкі, і 35 гадоў спатрэбілася для таго, каб у амідапірыну выявілася такое цяжкае пабочнае ўскладненне, як агранулацытоз. Вось чаму вывучэнне новых лекавых сродкаў працягваецца і пасля іх рэгістрацыі. Пры гэтым вельмі шмат залежыць ад адказнасці і назіральнасці ўрачоў...

— Дзмітрый Яўгенавіч, шчыра кажучы, заўсёды лічыла, што лекі, якія знаходзяцца ў безрэцэптурным водпуску, як мінімум, шкоды мне не прынясуць. Навошта ўвогуле дапускаць да выкарыстання ў медыцынскай практыцы лекавыя сродкі, калі няма стапрацэнтнай упэўненасці ў іх бяспечнасці?

— Праблема бяспекі лекаў — вельмі шматбаковая, і звязана яна як са з'яўленнем мноства лекавых сродкаў з высокай біялагічнай актыўнасцю, так і з ростам устойлівасці людзей да хімічных і біялагічных рэчываў, нерацыянальным прымяненнем лекаў і ўзаемадзеяннем прэпаратаў. У аснове эфектыўнай і бяспечнай фармакатэрапіі ляжыць рэгістрацыя і дазвол для выкарыстання ў медыцынскай практыцы толькі тых прэпаратаў, у якіх карысць ад іх прымянення значна перавышае рызыку. Але не менш важны фактар — гэта ўменне ўрача падабраць лекі для канкрэтнага выпадку з улікам усіх асаблівасцяў хворага і ўсіх уласцівасцяў прэпарата. На жаль, больш за палову ўсіх лекавых ускладненняў узнікае ў выніку нерацыянальнага (а зрэдку і зусім бяздумнага) выбару і прымянення нават вельмі добрых і эфектыўных лекаў.

Менавіта неразумнае выкарыстанне супрацьмікробных прэпаратаў і прывяло да фарміравання лекавай устойлівасці. Тут можна прыгадаць і злоўжыванне лекамі, калі тыя адпускаюцца ў занадта вялікай колькасці, так бы мовіць, «на ўсялякі выпадак,» або ўвогуле «па просьбе пацыента». Часта здараецца так, што эканамічныя цяжкасці прымушаюць пацыентаў спыніць лячэнне, як толькі ім стане лягчэй, замест таго, каб завяршыць курс, патрэбны для поўнага знішчэння ўзбуджальніка. Між іншым, лекавая ўстойлівасць абыходзіцца вельмі дорага для аховы здароўя.

Няправільнае выкарыстанне лекаў прывяло да сітуацыі, калі рынак літаральна засмечаны неэфектыўнымі, бескарыснымі ці неапраўдана дарагімі медыкаментамі. Актыўныя рэкламныя прапановы падштурхоўваюць людзей шукаць у сябе сімптомы розных захворванняў і часцей, чым гэта патрэбна, звяртацца да лекаў. Фармацэўтычны рынак пастаянна прырастае дзякуючы выпуску біялагічна актыўных дабавак і джэнерыкаў — танных аналагаў вядомых лекаў. Сёння доля джэнерыкаў на рынках ЗША, Вялікабрытаніі, Канады і Германіі перавышае 30%, а ў краінах Усходняй Еўропы дасягае 90%. Колькасць гандлёвых найменняў лекавых сродкаў расце ў геаметрычнай прагрэсіі. На пачатак 2005 года ў свеце іх было зарэгістравана больш як 10 000, з іх у Беларусі — больш як 5000. Усе яны прадстаўляюць крыху больш як 1500 міжнародных незапатэнтаваных назваў лекавых сродкаў.

На жаль, індывідуальныя магчымасці ўрачоў не бязмежныя з пункту гледжання засваення ўсяго асартыменту лекаў, што сёння прапануюцца фармацэўтычнымі вытворцамі. У 80-я гады спецыялістамі фармацыі ў Магілёўскай вобласці праводзілася пілотнае даследаванне аб'ёму асартыменту лекаў, што выпісваюцца на прыёме ў паліклініцы па ўліку рэцэптаў у аптэках. І высветлілася, што ўрачы выкарыстоўваюць у сваёй практыцы ад 60 да 200 найменняў лекавых сродкаў. Але ў тыя гады на дзяржаўным фармацэўтычным рынку было прадстаўлена намнога больш арыгінальных прадуктаў, чым адноўленых лекавых формаў...

> **«Лепш дэталёва ведаць і разумець меншую колькасць лекаў, чым быць павярхоўна азнаёмленымі з усімі»**

Сёння сітуацыя для ўрача-практыка стала яшчэ больш складанай. Ці можна памятаць адначасова больш як 3000 найменняў лекавых сродкаў? Прывяду некалькі прыкладаў: зараз на беларускім фармацэўтычным рынку прадстаўлена больш як 18 гандлёвых найменняў ніфедыпіну, 16 назваў цыпрафлаксацыну і 31 назва дыклафенаку.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначыла каля 270 міжнародных непатэнтаваных назваў найбольш важных (асноўных) лекаў. Большасць з іх — недарагія, праверваныя, іх надзейнасць і дастатковая бяспечнасць агульнавядомыя. Адным з першых крокаў да паляпшэння цяперашняй сітуацыі на фармацэўтычным рынку павінна стаць пераацэнка кампетэнтнымі органамі асартыменту лекаў, якія ёсць у кожнай краіне, каб знізіць працэнт нерацыянальнага выдаткоўвання сродкаў. З пункту гледжання эканомікі і належнай тэрапіі трэба засяродзіцца на забеспячэнні абмежаванай колькасці карысных лекаў і пазбавіцца ад найменш важных.

Вядучы спецыяліст у галіне аблягчэння болю і догляду за смяротна невылечна хворымі Р.Г. Твайкрос казаў: «Ніхто не можа неабгрунтавана сцвярджаць: маўляў, чым больш лекаў, тым лепш. Нацыянальныя пералікі, якія ўтрымліваюць тысячы лекаў, не лепшыя, чым больш абмежаваныя пералікі. Лепш дэталёва ведаць і разумець меншую колькасць лекаў, чым быць павярхоўна азнаёмленымі з усімі».

— І якім можа быць выйсце з гэтай сітуацыі?

— Важным рабочым інструментам пры прызначэнні прэпаратаў павінны стаць фармуляры лекавых сродкаў, увядзенне якіх у Беларусі сёння абмяркоўваецца. Фармуляр — гэта дакумент, які рэгламентуе выкарыстанне лекаў для дасягнення аптымальнай клінічнай і эканамічнай эфектыўнасці. Гэта, калі хочаце, інфармацыйна-метадалагічная дактрына, мэтай якой з'яўляецца развіццё сацыяльна арыентаванай сістэмы аховы здароўя ва ўмовах рынкавай эканомікі.

Асноўныя мэты эфектыўнага фармуляра — выбар прэпаратаў у адпаведнасці з іх адноснай бяспечнасцю і эфектыўнасцю, уключэнне (пры неабходнасці) альтэрнатыўных сродкаў другой лініі, мінімізацыя тэрапеўтычных прызначэнняў, максімальнае павышэнне эканамічнай эфектыўнасці фармакатэрапіі без зніжэння яе якасці, выключаючы, па магчымасці, выкарыстанне больш дарагіх лекавых сродкаў.

Фармуляр носіць абмежавальны характар і заахвочвае выкарыстанне толькі тых лекавых сродкаў, якія ў яго ўключаны.

— Калі я правільна зразумела, фармуляр адлюстроўвае стандарты сусветнай практыкі?

— Фармуляр патрэбны не для ўвекавечвання сусветных дасягненняў, а для аптымізацыі фармакатэрапіі і павелічэння частаты прызначэння лекавых сродкаў, якія вылучаюцца высокай ступенню эфектыўнасці і бяспекі. За гады працы ўрача з'яўляецца і знікае мноства розных прэпаратаў, і клініцысту зусім не абавязкова «апрабаваць» або набываць «уласны досвед» работы з навінкамі. Ёсць меркаванне, што калі ўрач не выкарыстоўвае сучасныя лекавыя сродкі, то ён рызыкуе згубіць сваю рэпутацыю і рэйтынг. Аднак не варта забываць, што гісторыя ведае дастаткова фактаў рэкордна хуткага ўкаранення ў лячэбную практыку лекавых сродкаў, якія затым праяўлялі небяспечную таксічнасць і адтэрміноўваныя адмоўныя рэакцыі. Да таго ж папулярнасць лекавых сродкаў сярод хворых і адпаведна ўзровень аб'ёмаў продажу могуць узрастаць не столькі дзякуючы перавагам гэтай прадукцыі ў параўнанні з іншымі лекавымі сродкамі, колькі дзякуючы палітыцы фірмы-вытворцы, якая рэкламнай кампаніяй уздзейнічае непасрэдна на абывацеля.

Большасць урачоў згодныя з тым, што любое новаўвядзенне ў медыцыне патрабуе фундаментальных даследаванняў і сапраўды доказнай базы. А эфектыўны фармуляр ні ў якім разе не абмяжоўвае клінічную свабоду. Больш за тое, ён толькі лішні раз пацвярджае той факт, што на самай справе кожны ўрач пры прызначэнні выкарыстоўвае не ўсе 10—12 тысяч найменняў лекаў, прадстаўленых на рынку, а прымяняе толькі абмежаваны набор з 25—400 найменняў. Прынцып уключэння ў даведнік толькі лекавых сродкаў з даказанай эфектыўнасцю, паўнацэнная і рупліва падрыхтаваная інфармацыя па іх выкарыстанні, верыфікацыя прызначэнняў, — усё гэта робіць фармуляр найбольш важным складнікам рацыянальнага і якаснага лячэння.

> **«На самай справе кожны ўрач пры прызначэнні выкарыстоўвае не ўсе 10—12 тысяч найменняў лекаў, прадстаўленых на рынку, а прымяняе толькі абмежаваны набор з 25—400 найменняў»**

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАБУДУЕМ ХОСПІС РАЗАМ!

або Нельга вылечыць — не значыць нельга дапамагчы

На будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса ў Бараўлянах неабходна сабраць $4 млн

Пад апекай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хоспіс» знаходзяцца дзеткі з цяжкімі анкалагічнымі захворваннямі ў апошняй стадыі і прыроджанымі парокамі развіцця. Іх жыццё адмерана месяцамі, тыднямі, днямі, гадзінамі... Тым не менш, яны хочуць правесці іх свабоднымі ад пакут і адзіноты. 400 тысяч неабыякавых беларусаў могуць працягнуць руку дапамогі і аблегчыць дзіцячы боль...

ПРАБЛЕМА: «70 % дзетак не могуць сёння атрымаць паліятыўную дапамогу»

Беларускі дзіцячы хоспіс на працягу 18 гадоў бясплатна аказвае дапамогу дзецям, якія маюць абмежаваны тэрмін жыцця з-за невылечнага захворвання, а таксама іх сем'ям (далей — паліятыўную дапамогу). Але з-за нестабільнага фінансавання, пра якое не па чутках ведаюць усе грамадскія арганізацыі, павысіць «якасць» жыцця (а значыць, аблегчыць боль усіх такіх дзетак) пакуль немагчыма.

Каментарый з Міністэрства аховы здароўя Беларусі

Іван РЫЖКО, начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі: «Наша міністэрства цалкам падтрымлівае ініцыятыву будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса і будзе садзейнічаць гэтаму працэсу. З міру па нітцы, цаглінка да цаглінкі — і будынак будзе гатовы. Беларусы падтрымаюць гэтую акцыю. Я ў гэтым не сумняваюся. Што тычыцца далейшага фінансавання, то ўтрымліваць медыка-санітарную службу новага хоспіса і падтрымліваць у належным еўрапейскім выглядзе сам будынак будзе непасрэдна Міністэрства аховы здароўя. Такая дамоўленасць ужо заключана».

Сёння ў розных кутках Беларусі, паводле слоў **намесніка дырэктара Беларускага дзіцячага хоспіса па медыцынскіх пытаннях Наталлі САВЫ,** у паліятыўнай дапамозе маюць патрэбу прыкладна 1,5 тысячы дзяцей. Але аказваецца яна штогод толькі крыху больш за 250 сем'ям, прычым, як правіла, з Мінска і Мінскай вобласці.

— Мы таксама разумеем, што ўжо не ў стане павышаць і якасць сваіх паслуг, — падкрэсліла **дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса Ганна ГАРЧАКОВА.** — А ўсё з-за цеснаты і малой функцыянальнасці будынка, дзе сёння размяшчаецца арганізацыя. Прыедзьце ў Бараўляны і паглядзіце: у нас няма ніводнага свабоднага квадратнага сантыметра плошчы, задзейнічаны і падвал, і гарышча.

Вялікія спадзяванні не толькі супрацоўнікі дабрачыннай арганізацыі, але і Міністэрства аховы здароўя Беларусі ўскладаюць на будаўніцтва новага сучаснага дзіцячага хоспіса — Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай паліятыўнай дапамогі. Яго з'яўленне, паводле іх слоў, дазволіць палепшыць «якасць» жыцця ўсіх цяжкахворых беларускіх дзетак, і адпаведна — жыццё іх сем'яў. Бо ад таго, як адчувае сябе дзіця, напрамую залежыць самаадчуванне яго мамы і таты, іх узаемаадносіны.

РАШЭННЕ: «Пра нашых дзяцей у першую чаргу павінны клапаціцца мы самі»

Ідэя будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса ў Беларусі нарадзілася год таму.

— Мы напісалі ліст на імя Прэзідэнта нашай краіны і дастаткова хутка атрымалі станоўчы водгук — выдзеліць пад будаўніцтва хоспіса зямлю ў Бараўлянах, — адзначыла Ганна Гарчакова.

— А чаму менавіта ў Бараўлянах?

— Бо менавіта там знаходзіцца адзіны ў Беларусі Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, з якім мы вельмі шчыльна супрацоўнічаем у вобласці аказання паліятыўнай дапамогі дзецям, — распавядае дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса.

Услед за Прэзідэнтам светлае пачынанне дабрачыннай арганізацыі ўхваліў і «БПС-Банк»: выдзеліў Br100 млн на пачатак праектных работ.

— Мы, у сваю чаргу, тут жа падпісалі дагавор з фірмай, якая і спраектавала новы будынак, — працягвае Ганна Гарчакова. — Цяпер справа за малым. Мы палічылі, што для таго, каб пабудаваць хоспіс, нам спатрэбіцца $4 млн.

— Як плануеце сабраць такую суму?

— Лічба велізарная, але калі задумацца... Нам трэба знайсці ўсяго толькі 400 тысяч неабыякавых людзей, якія ахвяруюць па 10 долараў на «цагліну» і такім чынам унясуць сваю лепту ў будаўніцтва. Я лічу, у Беларусі дастаткова спагадлівых і міласэрных людзей. Мы, безумоўна, будзем працягваць пісаць грантавыя праекты і тым самым прыцягваць сродкі з-за мяжы. Але акцэнт у зборы грошай будзем рабіць менавіта ў нашай краіне, бо лічым, што пра нашых дзяцей у першую чаргу павінны клапаціцца мы самі.

Што такое «Беларускі дзіцячы хоспіс»?

Гэта адна з нямногіх грамадскіх дабрачынных арганізацый у Беларусі, якая мае медыцынскую ліцэнзію. Супрацоўнікі хоспіса аказваюць бясплатную медыцынскую і сацыяльна-псіхалагічную дапамогу невылечна хворым дзецям і членам іх сям'і як у стацыянары, так і на даму. Акрамя таго, хоспіс прадастаўляе паслугі сядзелкі, неабходнае медыцынскае абсталяванне, медыкаменты, падгузкі для дзяцей.

Так будзе выглядаць новы дзіцячы хоспіс.

— Што будзе з сябе ўяўляць новы дзіцячы хоспіс?

— Новы хоспіс будзе складацца з некалькіх блокаў. Першы і асноўны — гэта стацыянар для дзяцей на 8 ложкаў.

— Чаму так мала?

— Такія сусветныя стандарты аказання дзіцячай паліятыўнай дапамогі, — тлумачыць Ганна Гарчакова. — У дзіцячых хоспісах не павінна быць больш за 12 ложкаў. Мы не можам пабудаваць хоспіс для ўсіх цяжкахворых дзяцей. Мы павінны стаць цэнтрам, які будзе аказваць дапамогу ў развіцці паліятыўнай дапамогі ў кожным кутку Беларусі.

— Нам патрэбны сучасны хоспіс зусім не для таго, каб забраць усіх дзяцей з дому і пакласці на свае ложкі, — дадала Наталля Сава. — Сэнс не ў гэтым. Ложкі патрэбны толькі для таго, каб забраць самых цяжкіх на непрацяглы час. Выключна для таго, каб падабраць лячэнне. А пасля зноў вярнуць дзіця ў родныя сцены. Не сакрэт, што кожнае дзіця прывязана да сваёй мамы, цацак, ложка. А цяжкахворае — у 10 разоў больш. І нават калі мы зробім самы ўтульны хоспіс, ён ніколі не заменіць дом. Таму наша асноўная задача — паляпшаць якасць жыцця такіх дзетак на даму.

Таксама ў новым хоспісе, паводле слоў Ганны Гарчаковай, будуць масажныя кабінеты, пакоі для правядзення гідра-, музыка-, святлотэрапіі, утульныя гульнявыя і нават мініаперацыйная для паліятыўнаінвазійнага ўмяшальніцтва. Ад кожнага ложка будзе адыходзіць монарэльс, які дазволіць медсястры з камфортам даставіць хворага ў прыбіральню, гульнявую ці працэдурны кабінет. Другі блок — гэта цэнтр дзённага знаходжання, трэці — адукацыйны, дзе будуць праводзіцца курсы для ўрачоў і медсясцёр, а таксама бацькоў. Гэта таксама будзе спрыяць павышэнню якасці жыцця дзіцяці на даму.

У новым будынку адкрыюцца і два гасцінічныя нумары для бацькоў, якія прывезлі дзіця з далёкай вёскі. Таксама на тэрыторыі цэнтра будзе пабудавана каплічка.

— Дзіцячы хоспіс — гэта не дарослы хоспіс, — дэманструе схему новага будынка Ганна Гарчакова. — Мы не робім бальніцу. Гэта будзе маленькі казачны замак.

Дарэчы, што цікава, у новым будынку калідоры будуць ісці змейкай, як у англійскіх хоспісах. Псіхолагі сцвярджаюць, што прамыя дзейнічаюць на дзіцячую псіхіку прыгнятальна.

— Калі прыходзіш у дзіцячы хоспіс у Англіі, ты не хочаш адтуль выходзіць: там цікава. Я хачу, каб дакладна так было і ў нас, — рэзюмавала дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса.

Ад сябе толькі дадам, што ўсю інфармацыю аб будаўніцтве новага хоспіса (працэсе збору грошай, этапах будаўніцтва, схемах) можна знайсці на сайце www.newhospice.by. Імёны неабыякавых людзей, якія набудуць «цагліну», супрацоўнікі Беларускага дзіцячага хоспіса абяцалі выгравіраваць на тых самых цаглінах. Акрамя таго, кожны беларус, які ахвяраваў сродкі на будаўніцтва будынка, атрымае сертыфікат, які сведчыць, што ён унёс сваю лепту ў добрую справу.

Надзея ДРЫЛА.

Спецыяльна для збору грошай на будаўніцтва дзіцячага хоспіса адкрыты дабрачынны рахунак:

ААТ «БПС-Ашчадбанк», код 369

Разліковы рахунак № 3135145259013 (беларускія рублі)

Атрымальнік: ГДА «Беларускі дзіцячы хоспіс», 223053 Мінскі раён, в. Бараўляны, вул. Бярозавы гай, 100 А, УНН 100806662

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ОАО «ПРОМИНВЕСТ»

Адрес: 220015, г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 33а, к. 1, тел. (017) 216 17 29 *УНП 100646457*
ФИО руководителя: Крук Владимир Михайлович
ФИО главного бухгалтера: Якубович Татьяна Ивановна
Среднесписочная численность работающих: 98 человек
Основной вид деятельности: розничная торговля

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2012 г.

млн. руб.

Актив	Код	На начало года	На конец года
I. Внеоборотные активы			
Основные средства	110	158	127
Вложения во внеоборотные активы	140	2	-
Итого по разделу I	**190**	**160**	**127**
II. Оборотные активы			
Запасы и затраты	210	1 467	2 843
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	164	150
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	19	23
Денежные средства	260	81	222
Финансовые вложения	270	7	7
Итого по разделу II	**290**	**1 738**	**3 245**
Баланс	**300**	**1 898**	**3 372**
Пассив	**Код**	**На начало года**	**На конец года**
III. Капитал и резервы			
Уставный фонд	410	37	37
Добавочный фонд	430	125	125
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	36	209
Доходы будущих периодов	470	29	63
Итого по разделу III	**490**	**227**	**434**
V. Краткосрочные обязательства			
Краткосрочные кредиты и займы	610	396	385
Кредиторская задолженность	620	1 234	2 502
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	28	30
Резервы предстоящих расходов	640	13	21
Итого по разделу V	**690**	**1 671**	**2 938**
Баланс	**700**	**1 898**	**3 372**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код	2011 год	2010 год
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	18 068	8 535
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров	011	2 537	1 197
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	15 531	7 338
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	11 865	5 514
Валовая прибыль	040	3 666	1 824
Расходы на реализацию	060	3 377	1 819
Прибыль (убыток) от реализации товаров	070	289	5
II. Операционные доходы и расходы			
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	-	-
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	130	2	1
Внереализационные расходы	150	-	2
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	2	-1
Прибыль (убыток) до налогообложения	240	291	4
Налог на прибыль	250	70	1
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	48	-
Чистая прибыль (убыток)	300	173	3

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

Наименование показателя	Ед. изм.	2011 год	2010 год
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн. руб	18,3	1,8
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	300	30
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб	6,08	3,2
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	61 000	61 000

Организация объявляет о проведении публичных торгов по продаже

Здания бывшей молочной кухни, находящейся в г. Слониме, ул. Брестская, д. 81, в состав которого входит:

капитальное строение. Представляет собой здание молочной кухни без учета подвала общей площадью 310 м². Составные части и принадлежности: подвал общей площадью 195 м², электрическая сеть протяженностью 330 м, тепловая сеть протяженностью 127,3 м.

Начальная стоимость лота — 740.000.000 бел. руб. без учета НДС.

Торги состоятся 21 мая 2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чеботарева, 2, комн. 8. Задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота перечисляется на р/с ЧТУП «Два Слона» № 3012703210013 в ОАО «Технобанк» г. Минск, код 182, УНП 190414655. Минимальная величина первого шага составляет 10 процентов стоимости реализуемого с торгов лота. Заявки и документы, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются в течение 30 дней с даты выхода объявления о торгах в рабочие дни с 11.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Чеботарева, 2, ком. 8. **Срок окончания приема заявок — 18.05.2012 г.** Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Телефоны для справок: (017) 230-82-01; (044) 7-37-37-80.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Открытое акционерное общество
«Могилевский завод искусственного волокна»
проводит открытый аукцион по продаже неиспользуемого имущества
Аукцион состоится 22 мая 2012 года в 12.00 по адресу:
г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Собственник, продавец и организатор аукциона: ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.
Контактный телефон (8-0222) 29 75 13.

№ лота	наименование	год выпуска	начальная цена с НДС, руб.	в т.ч. сумма НДС 20%, руб.	сумма задатка с НДС, руб.
1	Станок заточной ПН-6	1981	**13 100 000**	2 183 333	1 310 000
2	Станок фрезерный ФА-4	1981	**8 100 000**	1 350 000	810 000
3	Станок деревообрабатывающий ЦА-2А	1975	**16 500 000**	2 750 000	1 650 000
4	Станок деревообрабатывающий ЦКБ-40	1981	**16 500 000**	2 750 000	1 650 000
5	Станок настольно-сверлильный	1987	**3 000 000**	500 000	300 000
6	Малярная станция СО-115	1989	**18 310 000**	3 051 667	1 831 000
7	Лесорама Р-63-4А	1986	**15 140 000**	2 523 333	1 514 000
8	Пресс МГП -2	1987	**3 000 000**	500 000	300 000
9	Пресс МГП -2	1987	**3 000 000**	500 000	300 000
10	Таль электрическая 1012	1986	**400 000**	66 667	40 000
11	Электропогрузчик ЕВ-687.33	1998	**14 400 000**	2 400 000	1 440 000
12	Электропогрузчик ЕВ-687.33	1998	**14 400 000**	2 400 000	1 440 000
13	Трактор Т-150К 165 л.с. 15-13 IT	1989	**29 100 000**	4 850 000	2 910 000
14	Автомобиль УАЗ-3741 (специальная) 19-80 ТИ	1991	**6 300 000**	1 050 000	630 000
15	Смеситель ЗШ1000В	1992	**210 000 000**	35 000 000	21 000 000
16	Смеситель ЗШ-1000	1992	**210 000 000**	35 000 000	21 000 000
17	Весы торцевые РП-150	1992	**554 400**	92 400	55 440

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются не позднее 21 мая 2012 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491088 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 226, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

